КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №25 (153)
◂ 10 ЛІПЕНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час




**ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ ДЭПУТАТА ЛАЗІНСКАГА**

Стар. 12

**КРОПКА АДЛІКУ**

Толькі грамадства, якое складаецца з аўтаномных асобаў, здольнае стаць апорай апазіцыі, як, зрэшты, і апорай дзяржавы.

Стар. 4

**ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ МАЛАДЫМ НАСТАЎНІКАМ**

Як працуецца паводле размеркавання тым, хто мусіць адпрацаваць 2 гады на карысць дзяржавы?

Стар. 6

**КРЫЖЫКІ МОНТЭНЕГРА**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Нарыс Аляксея Хадыкі**

## Вяртанне страчанай спадчыны

**З цыклу "Таямніцы беларускай гісторыі"**

АД РЭДАКТАРА

# НАЦЫЗМ = СТАЛІНІЗМ

Аляксей Кароль

**Тэма, якая, здавалася б, даўно павінна была адыйсці ў гісторыю, на жаль, не страціла сваёй палітычнай актуальнасці. Больш за тое — палітычнай пагрозы. Менавіта гэтым і абумоўлена прыняцце 4 ліпеня Парламенцкай Асамблеяй АБСЕ рэзалюцыі «Пра аб'яднанне падзеленай Еўропы: абарона правоў чалавека і грамадзянскіх свабодаў у XXI стагоддзі ў рэгіёне АБСЕ». Рэзалюцыя асуджае два таталітарных рэжымы — нацызм і сталінізм.**

Рэзалюцыя асуджае таталітарызм у мінулым і спробы апраўдання яго сёння. Прапануе зрабіць 23 жніўня (дату падпісання пакту Молатава-Рыбентропа) Днём памяці ахвяраў сталінізму і нацызму, каб перашкодзіць ухваленню нацысцкага і сталінскага мінулага і прадухіліць з'яўленне неанацысцкіх рэжымаў.

Рэзка супраць прыняцця рэзалюцыі як антырасійскага дакумента, што скажае гісторыю, выступіла расійская дэлегацыя. Беларуская дэлегацыя адкрытых заяў не рабіла, а як галасавалі сябры — кожны паасобку — дакладна невядома.

Пазіцыя Расіі, а гэта найперш, зразумела, пазіцыя яе кіроўнай палітычнай эліты, уражвае і бянтэжыць. Не толькі таму, што на прасторах краіны ажывае і набывае жахлівае аблічча прывід неафашызму ў вобразе скінхедаў ды іншых груповак, адзначаных ужо крывавымі забойствамі па расавай ці нацыянальнай прыкмеце. Але ж і палітычнай лініяй пераемнасці, вольнай ці адвольнай, са сталінскім рэжымам.

Хай сабе, па знешняй аргументацыі, пратэстам быццам бы супраць скажэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Але ж пратэстам галаслоўным. Бо ўсё якраз наадварот — гісторыкамі даўно даказана (дарэчы, тымі ж расійскімі), што перамога ў вайне была дасягнутая не дзякуючы сталінскаму рэжыму, а насуперак яму, коштам вялізных ахвяр. Як была даказаная і афіцыйна прызнаная яшчэ вышэйшым кіраўніцтвам КПСС і СССР наяўнасць патаемных пратаколаў да пакта Молатава-Рыбентропа пра падзел Еўропы. І тады ж былі абнародаваны вызваленыя са спецсховішчаў кадры кінахронікі і фотаздымкі пра сумесны вайсковы парад частак Чырвонай і гітлераўскай армій у Брэсце ўвосень 1939 года. Агульная колькасць толькі афіцыйна рэабілітаваных да другой паловы 1990 года — больш за 2 мільёна чалавек. Што за гэтай лічбай, як не генацыд?

Дык няўжо пасля ўсяго гэтага чарговы адкат? На жаль, прыкметы таго дастаткова выразныя. Дзеля чаго? Інакш як постімперскім сіндромам, ідэяй аднаўлення вялікай і магутнай дзяржавы ў любым яе абліччы, але толькі не дэмакратычным, гэта патлумачыць цяжка.

З гэтай, дарэчы, ідэі і пачынаўся сталінскі таталітарызм. Як і гітлераўскі. Больш таго, гісторыкамі даўно даказана, што сталінская мадэль паслужыла для Гітлера наўпроставым узорам для будаўніцтва сваёй уласнай. Гэта ёсць дзве класічныя мадэлі таталітарызму.

Квазіідэя сталінізму — класавая, будаўніцтва сацыялізму як "поўнай, даведзенай да канца дэмакратыі". Квазіідэя нацызму — расавая, з адкрытым адмаўленнем дэмакратыі. Абедзве яны служылі не больш чым прыкрыццём сцвярджэння дыктатарамі свайго панавання ва ўласнай краіне і сусветным маштабе. Аднолькавымі метадамі пры абсалютна падобных карных сістэмах. Праз татальную ілжу. Праз татальны тэрор. Праз сусветную рэвалюцыю і вайну.

А што ж з Беларуссю? Узгадваецца адзін эпізод з уласнай даўняй даследчай аспіранцкай практыкі гісторыка. Я працаваў па тэме палітыкі дзяржаў-пераможцаў у пасляваеннай Германіі з архівамі Савецкай ваеннай адміністрацыі, у закрытым сховішчы, па абмежаваным допуску. Побач працавалі калегі па сваіх тэмах. Адноўчы адзін з іх паклікаў мяне падыйсці да яго стала: «Паглядзі, вось дакументы планавых лічбаў па ліквідацыі антысавецкіх элементаў, здраднікаў і памагатых гітлераўскіх акупацыйных уладаў. Памесячна са жніўня да канца 1944 года. А вось — на 1945-ы». Лік ішоў на дзесяткі тысяч. І гэтыя планы, у адрозненні ад гаспадарчых, выконваліся.



К заключению советско-германского договора о ненападении. На снимке (справа налево): тов. В. М. Молотов, тов. И. В. Сталин, г-н Иоахим фон Риббентроп и г-н Ф. Гаус.

Потым, напрыканцы 1980 — пачатку 1990-х гадоў, калі дзверы спецсховішчаў прыадчыніліся крыху шырэй, мне пашчасціла ўжо на матэрыялах беларускіх архіваў рыхтаваць даведкі для рэабілітацыі шэрагу так званых нацдэмаў — Зміцера Жылуновіча, Усевалада Ігнатоўскага, іншых. Адкрываліся цэлыя пласты невядомай, рэпрэсаванай гісторыі Беларусі. З адным вельмі важным, актуальным і для разумення сённяшняй палітычнай сітуацыі кантрапунктам: менавіта на Беларусі і Украіне па загаду і пад асабістым кантролем Сталіна адпрацоўвалася тая мадэль таталітарнага рэжыму, якая сцвердзілася пад назвай сталінізму. Менавіта тут былі сфабрыкаваны і прайшлі першыя працэсы па так званых справах "Саюза вызвалення Беларусі" (СВБ) і "Саюза вызвалення Украіны". Прычым па СВБ, з-за пратэстаў інтэлігенцыі і партыйнага кіраўніцтва, на той час беларускага, Маскве давялося адмовіцца ад першаснай задумы правесці адкрыты працэс. Усе да аднаго кіраўнікі АГПУ-НКУС у Беларусі, што па чарзе раскручвалі тут механізм рэпрэсій, былі прысланы з Масквы.

Рэпрэсіі сталінскага рэжыму ўвайшлі ў масавую свядомасць і падсвядомасць насельніцтва Беларусі ўсё ж такі пераважна як знешняя навала. Палітыка русіфікацыі адбілася на стане мовы, але так і не пераадолела да канца ўплыў палітыкі беларусізацыі, што праводзілася тут у 1920-я гады.

Таму і сёння ў масавай свядомасці па сутнасці не адчуваецца тугі па сталінізму, няма падобнай на расійскую па моцы і агрэсіўнасці хвалі стварэння неафашысцкіх груповак.

Ёсць праяўленні гэтай тугі на афіцыйным узроўні: супраціўленне стварэнню мемарыяльнага комплексу Курапаты, пабудова "лініі Сталіна", замоўчванне тэмы рэпрэсій, пераключэнне на сябе перамогі ў Вялікай Айчыннай... Але ўсё ж гэта афіцыйная туга носіць абмежаваны характар і разлічана на выбарачнае выкарыстанне фрагментаў з мінулага ў падмацаванне аўтарытэта сучаснага правадыра.

Таму і не было афіцыйнай рэакцыі на рэзалюцыю АБСЕ. Але таму ж не будзе і афіцыйнай яе падтрымкі. Беларусі ўдалася вырвацца з зоны забыцця сябе самой, але пакуль толькі ў зону гістарычнага і палітычнага напаўзабыцця. Нам яшчэ ісці да Беларусі.

Працяг тэмы на стар. 14

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БАБРУЙСК. ДА ЗЕМЛЯКОЎ З ВЫСТАВАЙ

У выставачнай зале Бабруйска адбылося ўрачыстае адкрыццё персанальнай выставы народнага мастака РБ, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дзейснага сябра Расійскай акадэміі мастакоў Георгія Палаўскага, які нарадзіўся і вырас на Бабруйшчыне. Мэтр мастацтва прадставіў землякам свае жывапісныя і графічныя працы. Акрамя таго творца перадаў гарадскім уладам дакумент, паводле якога ён дорыць частку сваёй творчай спадчыны гораду.

### ЛІДА. ПЕРАВАРОТ У ЛІДСКІМ ЗАМКУ

Гарадская адміністрацыя Ліды паспрыяла ініцыятыве грамадскіх арганізацый горада і раёна аднавіць знакаміты замак. Пачаўся чарговы этап рэканструкцыі беларускай архітэктурнай спадчыны. Архітэктурны праект падрыхтавалі мінскія спецыялісты. Ён прадугледжвае аднаўленне замка ў яго першапачатковым выглядзе. Пакуль не ясна, што будзе з правядзеннем ужо традыцыйных рыцарскіх турніраў у Лідскім замку.

Акрамя таго, на плошчы 600-годдзя Ліды плануецца ўстанавіць помнік заснавальніку горада вялікаму князю Гедыміну.

### РАГАЧОЎ. ДЗІЦЯЧЫ ЛЕТНІК ДЗЕЙНІЧАЕ

Адбылося адкрыццё інтэрнацыянальнага дзіцячага летніка на беразе возера Добрае. Адпачынак тут дзяцей стаў ужо традыцыяй. Сёлета на Добрым адпачываюць дзеці з Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ПЕРАЗАГРУЗКА БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІХ АДНОСІН

**Генадзь Кеснер**

**Старшыня АГП Анатоль Лябедзька і кіраўнік Навукова-даследчага цэнтра Мізеса Яраслаў Раманчук сустрэліся ў Маскве з расійскімі палітыкамі і экспертамі. Пра вынікі сваіх сустрэч і асноўныя аспекты ўзаемаадносін Расіі і Беларусі яны распавялі на прэс-канферэнцыі 7 ліпеня.**

“Мы канстатуем, што існуе перманентны крызіс беларуска-расійскіх адносін, мы сведчым, што тая прававая база, якая знаходзіцца ў падмурку гэтых стасункаў, не вытрымлівае крытыкі, і, на наш погляд, зараз патрэбна “перазагрузка” беларуска-расійскіх адносін, — заявіў Анатоль Лябедзька. — Мы прапануем, каб да гэтай супрацы далучылася грамадзянская супольнасць, якая да гэтага часу знаходзілася на абочыне ўсіх гэтых працэсаў. Манаполія на беларуска-расійскія адносіны знаходзілася ў Крамлі і ў беларускім Чырвоным доме. Найбліжэйшым часам мы плануем стварыць некалькі камунікацыйных пляцовак, на якіх будзе выпрацаваны новы погляд на беларуска-расійскія дачыненні”.

Знайсці тых, хто гатовы падтрымаць такую ідэю ў Расіі, па словах палітыка, і было асноўнай мэтай паездкі ў Маскву. Раманчук, дырэктар Цэнтра Мізеса, што адказны менавіта за эканамічны складнік, ужо ачоліў створаную працоўную экспертную групу, якая будзе выпрацоўваць дакументы для ўзгаднення на палітычным узроўні. Анатоль Лябедзька падкрэсліў, што Аб’яднаныя дэмакратычныя сілы павінны мець пэўны завершаны дакумент, які можна было б выкарыстоўваць для працы з Расіяй, з яе палітычнай і грамадзянскай супольнасцю.

Па словах Яраслава Раманчука, падчас сустрэч у Маскве беларускія ўдзельнікі асаблівы акцэнт зрабілі на тым, што пры пабудове новых стасункаў паміж Беларуссю і Расіяй Беларусь можа разглядацца толькі як незалежная, суверэнная дэмакратычная дзяржава, а не меркаваная частка Расійскай Федэрацыі.

У найбліжэйшыя месяцы АДС Беларусі маюць намер правесці тры канферэнцыі, падчас якіх плануецца выпрацаваць сваю пазіцыю па трох асноўных накірунках — узаемадачыненні з Расіяй, Еўрапейскім Саюзам, а таксама Злучанымі Штатамі Амерыкі.

Першая канферэнцыя плануецца ў жніўні ў Мінску, на ёй будуць абмяркоўвацца пытанні беларуска-расійскіх узаемаадносін. Чакаецца, што на яе прыедуць расійскія палітыкі, эксперты, эканамісты з вядомымі імёнамі. Будуць таксама накіраваны запрашэнні ў замежныя амбасады.

Яшчэ дзве канферэнцыі павінны адбыцца ў другой палове верасня (магчыма, у Вільнюсе). Адна з іх будзе прысвечана праграме Еўрапейскага Саюза “Усходняе партнёрства”, а другая — канчатковаму варыянту “дарожнай карты” па ўступленню Беларусі ў Савет Еўропы і ў ПАСЕ.

ГАДАВІНА

# ПАМЯЦІ ДЗМІТРЫЯ ЗАВАДСКАГА

**Любоў Праневіч**

**Сёлета споўнілася 9 гадоў з таго дня, як без вестак знік аператар Дзмітрый Завадскі. 7 ліпеня 2000 года Завадскі выехаў на машыне ў аэрапорт “Мінск–2”, каб сустрэць свайго калегу Паўла Шарамета, і знік пры нявысветленых абставінах.**




У сакавіку 2002 года чатыром былым супрацоўнікам спецпадраздзялення МУС Беларусі “Алмаз” былі прад’яўленыя абвінавачванні ў выкраданні Завадскага. Па версіі следства, матывам паслужыў рэпартаж тэлекампаніі НТВ, падрыхтаваны Дзмітрыем, дзе расказвалася, што сярод байцоў, якія ваявалі на баку чачэнскіх сепаратыстаў, знаходзіліся і грамадзяне Беларусі. Валеры Ігнатовіч і Максім Малік былі асуджаныя да пажыццёвага зняволення. Абвінавачаныя сваёй віны не прызналі. Сям’я Завадскага лічыць, што доказы віны асуджаных былі сабраныя з парушэннем заканадаўства, і што сапраўдныя вінаватыя да гэтага часу знаходзяцца на свабодзе.

Грамадскасць лічыць, што Завадскі быў забіты. Але за 9 гадоў следчыя не знайшлі, каго ў гэтым вінаваціць, як і не знайшлі яго цела. Справу аб выкраданні Дзмітрыя Завадскага некалькі разоў прыпынялі і ўзнаўлялі. Апошні раз яна была прыпыненая ў 2006 годзе, адразу пасля прэзідэнцкіх выбараў, і да гэтага часу не ўзнаўлялася. Сям’я зніклага журналіста абураная тым, што за 9 гадоў следчыя органы не змаглі знайсці новых звестак, каб даць ход справе ці перадаць яе ў судовую вытворчасць. Маці і жонка зніклага неаднаразова заяўлялі хадайніцтвы і звярталіся да беларускага і расійскага прэзідэнтаў, а таксама да кіраўнікоў урадаў еўрапейскіх краін і ЗША з прапановай пра стварэнне незалежнай экспертнай камісіі па расследаванню спраў зніклых.

Нагадаем, што да Завадскага без вестак зніклі экс-міністр унутраных спраў генерал Юрый Захаранка, віцэ-спікер Вярхоўнага Савета 13-га склікання, старшыня ЦВК Віктар Ганчар і яго сябра прадпрымальнік Анатоль Красоўскі. Паназіранні за гэтымі чатырма гучнымі справамі быў створаны спецыяльны камітэт пры Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы. А Рэспубліка Беларусь так і не ратыфікавала “Канвенцыю аб абароне ўсіх людзей ад гвалтоўных знікненняў”, прынятую ў канцы 2006 года Генеральнай Асамблеяй ААН.

ВАНДАЛІЗМ

# СПРАВА ПРЫПЫНЕНА

**Генадзь Кеснер**

**6 ліпеня прыпынена расследаванне крымінальнай справы па факту вандалізму на двух месцах пахаванняў ахвяр сталінскіх рэпрэсій у Курапатах.**

Расследаванне прыпынена ў сувязі з тым, што “не былі выяўлены асобы, якія падлягаюць прыцягненню да адказнасці ў якасці абвінавачваемых”.

Нагадаю, што на пачатку красавіка невядомыя ўскрылі ў Курапатах, непадалёк ад галоўнай алеі, два магільнікі, у адным з іх была вялікая колькасць косных парэшткаў, якія ў ходзе крымінальнай справы былі вынятыя для правядзення судова-медыцынскай экспертызы, а пазней урачыста перапахаваны прадстаўнікамі дэмакратычнай грамадскасці.

Старшыня Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч адзначыў, што ад самага пачатку, як толькі была заведзена крымінальная справа па красавіцкіх падзеях у Курапатах, ён не верыў у тое, што злачынцаў знойдуць і пакараюць.

За ўсю гісторыю існавання “народнага мемарыяла” ва ўрочышчы Курапаты, дзе, паводле розных ацэнак, падчас сталінскіх рэпрэсій у 1937–1941 гадах былі забіты ад 30 да 250 тысяч чалавек, акты вандалізму адбываліся дзесяткі, калі ўжо не сотні разоў. Найбольш (каля 15 разоў) ад рук зламыснікаў цярпела так званая “лава Клінтана” — мемарыяльны знак “Ад народу Злучаных Штатаў Амерыкі — народу Беларусі дзеля памяці”, адкрыты прэзідэнтам ЗША Білам Клінтанам у 1994 годзе. Не так даўно дэмакратычныя актывісты схапілі на месцы злачынства двух маладых людзей, якія знішчалі памятныя крыжы на курапацкіх магілах, і нават была заведзена крымінальная справа, але ўсё скончылася тым, што зламыснікаў амніставалі. А акты вандалізму ў святым для кожнага сумленнага чалавека месцы працягваюцца.

ВІЗІТ

# МІСІЯ АБСЕ Ў МІНСКУ

**7–8 ліпеня ў Мінску з візітам знаходзілася дэлегацыя кіраўніцтва палявых місій АБСЕ ўсходнееўрапейскага рэгіёна.**

Дэлегацыя складалася з 18 чалавек. Сярод іх амбасадар Філіп Рэмлер — кіраўнік місіі ў Малдове, Любамір Капай — каардынатар праграм па Украіне, Далгат Жумалаў — першы сакратар Пастаяннага прадстаўніцтва Казахстана ў АБСЕ, краіны, якая ў наступным годзе прымае старшынства ў АБСЕ, а таксама прадстаўнікі розных інстытутаў АБСЕ, у прыватнасці, БДІПЧ, Бюро прадстаўнікоў па пытаннях свабоды СМІ, Парламенцкай асамблеі.

Візіт насіў працоўны планавы характар — нарада, якія ладзяцца раз на год на базе той ці іншай місіі АБСЕ, дзеля каардынацыі і актывізацыі працэсаў рэалізацыі праграм, паляпшэння іх менеджменту. У мінулым годзе такая нарада праходзіла ў Малдове.

На сустрэчы ў Мінску абмяркоўваліся сумесныя праграмы ў сферы энергазабеспячэння і экалогіі.

Увечары 7 ліпеня па ініцыятыве кіраўніка офіса, пасла Ханса Георга Шмідта адбылася нефармальная сустрэча дэлегацыі з прадстаўнікамі замежных дыпламатычных місій, беларускіх навуковых колаў і міністэрстваў, а таксама з прадстаўнікамі беларускай грамадскасці, партый і СМІ з Мінска і з рэгіёнаў.

Як адзначыў сп. Шмідт у размове з журналістам «НЧ», галоўны сэнс гэтай нефармальнай сустрэчы ён бачыць у пашырэнні ўзаемаразумення наконт рэалізацыі праграм, скіраваных на карысць Беларусі і яе народа.

8 ліпеня дэлегацыя АБСЕ правяла шэраг сустрэч у Міністэрстве замежных спраў Беларусі.

**Уласная інфармацыя**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЛЮБОЎ — ХАЛОДНАЯ ВАЙНА

Сяргей Салаўёў



Арцём Дубскі

**Беларусь з шыкам адсвяткавала Дзень вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Наступнае маштабнае свята з гэтай катэгорыі — дзень перамогі над фашызмам. Але перамога перамогай, а гандлёвыя войны паміж Расіяй і Беларуссю не сціхаюць. І ніхто не можа прадказаць, хто ж у гэтых войнах выйдзе пераможцам.**

6 ліпеня на нарадзе ў Растове-на-Доне гендырэктар "Растсельмаша" Валерый Мальцаў заявіў пра "скрыты" імпарце беларускай сельгастэхнікі ў Расію. Паводле яго слоў, беларускі "Гомсельмаш" пастаўляе тэхніку ў Бранск, дзе на машынах "мяняюцца этыкеткі, афармляюцца дакументы як на выробленыя ў Расіі, і потым на іх распаўсюджваюцца расійскія льготы".

Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін паабяцаў гэтыя звесткі праверыць. Як зазначалася на нарадзе, урад РФ выдзяляе субсідыі пры куплі расійскай сельгастэхнікі. Апрача таго, дзейнічае рашэнне, згодна з якім бюджэтныя сродкі можна накіроўваць на закупку сельгастэхнікі, якая вырабляецца ў Расіі. Пуцін падкрэсліў, што даступнасць рынкаў Расіі і Беларусі павінна быць раўназначная.

У сваю чаргу на расіян паскардзіўся беларускі віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка. "Расія пакуль не пагаджаецца на субсідзіраванне на парытэтнай аснове закупак беларускай тэхнікі. І сёння можна канстатаваць, што ідзе забарона на рэалізацыю беларускай тэхнікі", — сказаў ён.

8 ліпеня на беларуска-расійскіх перамовах у Мінску абмяркоўвалася праблема ўзаемных паставак сельгастэхнікі. Для ўдзелу ў перамовах у Мінск накіравалася дэлегацыя расійскага Саюза вытворцаў сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання для АПК ("Саюзаграмаш"). Да чаго яны там дагаварыліся, пакуль невядома. Але прагнозы экспертаў несуцяшальныя.

"Гандлёвыя войны" Беларусі і Расіі будуць працягвацца, заявіў 7 ліпеня на прэс-канферэнцыі ў Мінску эканаміст Яраслаў Раманчук.

"Безумоўна, будзе расследаванне наконт дэмпінгавых паставак беларускім бокам аграрнай тэхнікі ў Расію. Наколькі мне вядома, Расія вярнула нам чатыры тысячы трактароў, бо яны былі дрэннай якасці. І гэтыя трактары былі адпраўлены ў Туркменістан", — сказаў Раманчук.

Таксама, паводле яго слоў, будзе працягвацца "перманентны нафтагазавы канфлікт". "З бюджэту знікла 8 трыльёнаў рублёў кампенсацыі на перапрацоўку нафты, што робіць бессэнсоўнай перапрацоўку нафты ў Беларусі. Такім чынам, можна меркаваць пра скарачэнне перапрацоўкі нафты на нашых камбінатах", — заявіў эканаміст.

На яго думку, узнікнуць пытанні наконт працы "Белтрансгаза". "Хутчэй за ўсё, беларускі бок будзе патрабаваць крэдыты пад перадачу Расіі 50% акцый гэтага прадпрыемства. Беларускі бок будзе па-ранейшаму настойваць, што гэты пакет каштуе 5 мільярдаў долараў. Расійскі бок будзе настойваць на меншай цане, бо цэны на газ змяніліся", — лічыць Раманчук.

Ён таксама прагназуе праблемы з доступам расійскіх кампаній на беларускі банкаўскі рынак. "Нядаўна ў Беларусь прыязджаў Герман Грэф (кіраўнік расійскага "Ашчадбанка"), які прапрацоўваў пытанне пра набыццё "Белпрамбудбанка". На якіх умовах прадаваць банкі, якім чынам даваць доступ расійскаму капіталу на беларускі банкаўскі рынак — наконт гэтага беларускі бок будзе гандлявацца", — прагназуе Раманчук.

"Таксама будуць параўнальна дробныя пытанні накшталт доступу на расійскі рынак беларускага мяса, малака і іншага. Таму што ні па адной таварнай групе няма дамоўленасцей. Карацей, нас чакае вельмі цікавы канец лета, пачатак восені і вельмі цікавы канец года", — заключыў Раманчук.

Невядома, за што і як будзе гандлявацца Беларусь з Расіяй. Але ў гандлі з Еўропай беларускія ўлады скарыстоўваюць даўно правераную і эфектыўную тактыку. Здавалася б, пасля вызвалення Эмануіла Зельцэра ў Беларусі не засталося тых "закладнікаў", з-за якіх можна было б гандлявацца. Але логіка тут простая: калі іх не засталося — дык зробім!

7 ліпеня быў асуджаны актывіст міжнароднай моладзевай арганізацыі "Малады фронт" (Чэхія) Арцём Дубскі. Дубскі прызнаны вінаватым у злачынстве, прадугледжаным артыкулам 415 Крымінальнага кодэкса (ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі). Моладзевага актывіста ўзялі пад варту непасрэдна ў зале суда.

Суд прыгаварыў Дубскага да шасці месяцаў утрымання ў калоніі агульнага рэжыму па артыкуле 415 КК, а таксама прыняў да ўвагі тое, што ён павінен адбываць яшчэ адзін год абмежавання волі за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі прадпрымальнікаў у студзені 2008 года. Гэта пакаранне ў дачыненні да Дубскага залічваецца як "два дні за дзень" — гэта значыць, два дні абмежавання волі лічацца як дзень, праведзены ў калоніі. На падставе гэтага суддзя змяніла пакаранне Дубскаму з абмежавання волі на ўтрыманне ў калоніі. Такім чынам, ён павінен правесці ў калоніі год.

Шмат якія праваабаронцы і аналітыкі ацанілі такі прысуд як "узяцце закладніка". Асабліва на тым фоне, што сусветная праваабарончая арганізацыя "Міжнародная амністыя" прызнала Арцёма Дубскага і яшчэ дзесяць грамадскіх актывістаў, асуджаных за ўдзел у акцыях пратэсту прадпрымальнікаў, вязнямі сумлення. Тут сапраўды ёсць за што гандлявацца. Больш за тое, Дубскі як злосны парушальнік рэжыму пакарання не падпадае пад амністыю, якая праходзіць зараз у Беларусі.

А пакуль нашы суды змагаюцца са "злоснымі парушальнікамі", з не самымі апошнімі асобамі нашай такой роднай і такой саюзнай дзяржавы ў Беларусі адбываюцца анекдоты. 2 ліпеня ў дзяжурную часць Брэсцкага аддзела ўнутраных спраў на транспарце звярнуўся дарадца мэра Смаленска. Ён сказаў, што з купэ цягніка "Масква — Берлін", у якім разам з мэрам ён ехаў за мяжу, была выкрадзена яго сумка, у якой знаходзіліся асабістыя рэчы дарадцы, а таксама два пашпарты — яго і мэра. 5 ліпеня выкрадзеная сумка была знойдзена супрацоўнікамі АУСТ недалёка ад чыгуначнай станцыі Цеўлі Кобрынскага раёна. У ёй было ўсё, апрача грошай, што належалі дарадцу.

Ці знойдуць тых, хто пакрыўдзіў дарадцу Смаленскага мэра, — невядома. Звычайна такія справы канчаюцца "вісякамі". Што, дарэчы, якраз і не дзіўна ў рэчышчы гандлёвых войнаў.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ГЕОРГІЙ МАРЧУК



Беларуская Рада па маральнасці будзе сачыць за рэакцыяй жыхароў краіны на кнігі і кіно. І хаця стваральнікі рады заяўляюць, што нічога супольнага з цэнзурай не мае, але сёе-тое яны ўжо зараз гатовыя паставіць пад сумнеў.

Сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Георгій Марчук заявіў, што практычна ацэньваць маральнае аблічча беларускага кніжнага і кіношнага рынка спецыялісты яшчэ не пачалі, але ўжо гатовыя назваць некалькі твораў і фільмаў, да якіх, па іх меркаванні, варта ставіцца з насцярогай. Марчук патлумачыў прынцып працы створанай структуры: "Гэта грамадская арганізацыя, у склад якой уваходзяць больш 30 прадстаўнікоў розных канфесій, пісьменнікі, мастакі, работнікі культуры, спецыялісты міністэрстваў культуры, адукацыі, інфармацыі. Мы будзем адсочваць усе культурныя навінкі, назіраць за рэакцыяй людзей на так званыя спрэчныя творы, задзірлівыя палярныя меркаванні, а потым знаёміць міністэрствы і ведамствы з вынікамі нашых даследаванняў". Георгій Марчук выказаў здагадку, што кніга расійскага пісьменніка Уладзіміра Сарокіна "Блакітнае сала" або камедыя "Гітлер капут!", якая нядаўна была ў беларускім кінапракаце, цалкам маглі б патрапіць пад увагу рады. Пры гэтым сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі падкрэсліў, што мэта структуры простая — "не даць загінуць высокім маральным ідэалам, якія ёсць у грамадстве. Мы будзем толькі рэкамендаваць зацікаўленым ведамствам зважаць на асаблівую крайнасць таго або іншага твора". Але ні для каго не сакрэт, што ў Беларусі рэкамендацыі чыноўнікаў маюць абавязковы для выканання характар, а на месцах лічаць за лепшае "перавыканаць, чым недавыканаць". Глядзіш, і меней культурнай прадукцыі ў крамах і кінатэатрах, якая не адпавядае густу сяброў новастворанай рады.

### ЮРЫЙ ШАЎЧУК



Хаця лідэр групы ДДТ Юрый Шаўчук і не беларус, але за яго падтрымку беларускасці, думаем, варта далучыць знакамітага спявака да ліку "Фігураў тыдня". Падчас канцэрту, прысвечанаму афіцыйнаму Дню Незалежнасці Беларусі ў Магілёве, лідэр групы ДДТ Юрый Шаўчук са сцэны заявіў, што вельмі любіць беларускае малако і заклікаў не забываць родную мову, перадае інтэрнэт-рэсурс "Беларускі партызан". У перапынках паміж песнямі Юрый Шаўчук не адзін раз гаварыў пра тое, як яму спадабаўся Магілёў. А ў песні "Каханне" нават экспромтам замяніў "Няву" на "Днепр". Пад канец свайго выступу спявак у парыве заклікаў беларусаў не забываць родную мову. Спадзяемся, што да парады гуру расійскага рока прыслухаюцца не толькі яго беларускія прыхільнікі.

### МАКСІМ СКАВЫШ



Нападаючы футбольнага клуба БАТЭ Максім Скавыш узначаліў спіс бамбардзіраў чэмпіянату Беларусі па футболе. У актыве дзевятнаццацігадовага спартоўца дзесяць забітых галоў. За ім у рэйтынгу з адставаннем у адзін гол — аднаклубнік паўабаронца Сяргей Крывец, на трэцім месцы — нападаючы футбольнага клуба «Гомель» бразілец Майкон Каліжуры. Максіма Скавыша ўжо называюць галоўным адкрыццём першай паловы чэмпіянату Беларусі. Яшчэ летась хлопец не мог патрапіць нават у склад БАТЭ, а сёлета выйшаў на першы радок спісу бамбардзіраў. Пры гэтым у чэрвені Максім не патрапіў у склад маладзёжнай зборнай на чэмпіянат Еўропы. Адмыслоўцы лічаць, што нашай зборнай для ўдалага выступу ў Швецыі, дзе праходзіў чэмпіянат, на хапала акурат такога вострага нападаючага, як Скавыш. У адным з інтэрв'ю Максім расказаў, што для яго ўзорам спартовага майстэрства з'яўляецца нападаючы клуба БАТЭ, трохразовы чэмпіён Беларусі Віталь Радзівонаў.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# КРОПКА АДЛІКУ

Сяргей Нікалюк



**Толькі грамадства, якое складаецца з аўтаномных асобаў, здольнае стаць апорай апазіцыі, як, зрэшты, і апорай дзяржавы.**

Пра апазіцыю зразумела, а пра дзяржаву? Звернемся да гістарычнага прыкладу (глядзі табліцу). Страты забітымі і паранёнымі сярод асноўных краін — удзельніц першай сусветнай вайны былі прыкладна роўныя, а вось у палон рускія здаваліся ў 3,9 разы часцей за немцаў і ў 5,3 разы — за французаў!

**Страты ў першай сусветнай вайне, млн. чалавек**

| Краіны | Забітыя | Паранёныя | Палонныя |
|---|---|---|---|
| Францыя | 1,39 | 3,04 | 0,45 |
| Германія | 1,81 | 4,25 | 0,62 |
| Расія | 1,65 | 3,85 | 2,40 |

Салдаты царскага войска ў першую сусветную вайну — гэта ў асноўным сяляне. Яны не праяўлялі асаблівага энтузіязму паміраць «За Бога, Цара і Айчыну». Асабліва «За Айчыну», таму што ў патрыярхальна-грамадскім светапоглядзе селяніна папросту не было месца для настолькі абстрактнага паняцця. Яго сусвет заканчваўся за ваколіцай вёскі. Падобна жнеям з казкі «Кот у ботах», селянін быў гатовы працаваць на любога пана, што, уласна кажучы, і рабіў на працягу стагоддзяў. У адрозненне ад шляхты і інтэлігенцыі, селянін не адчуваў ніякага жадання адваёўваць Дарданелы і ўздымаць крыж на Святую Сафію ў Канстанцінопалі, ды ён і не ведаў, што гэта такое.

## Праблема грамадзяніна

У Еўропе, у адрозненне ад Расіі, працэс фармавання грамадзянскіх нацый да пачатку першай сусветнай вайны ішоў ужо поўным ходам. Зразумела, і тут не ўсё было так проста. З аднаго боку, менавіта нацыяналізм стаў урадлівай глебай для еўрапейскага ўра-патрыятызму, без якога лакальная падзея (забойства спадчынніка аўстрыйскага прастолу) не перарасла б так лёгка ў сусветную вайну. З іншага боку — узгаданыя вышэй суадносіны палонных.

Праблема грамадзяніна, актуальная сто гадоў таму ў царскай Расіі, актуальная і ў сучаснай Беларусі. На дзяржаўным патэрналізме, заквашаным на патрыятычнай рыторыцы савецкага кшталту, грамадзяніна не выхаваць. Здавалася б, колькасць жадаючых аб'яднацца з Расіяй у адзіную дзяржаву за апошнія гады скарацілася ў разы (у 2002 годзе — 38%, у 2008-м — 11%), але не трэба спяшацца радавацца. Узровень патрыятызму ў Беларусі знаходзіцца ў зваротнай залежнасці ад росту даходаў. Усё добра, пакуль усё добра. Але варта дзяржаве замарудзіць з сацыяльнымі выплатамі, як колькасць жадаючых аб'яднацца з Расіяй узрастае, у першую чаргу за кошт пенсіянераў. У маладых — свой вектар. Яны пачынаюць больш актыўна пазіраць на Захад.

## «Наша Перамога»

3 ліпеня краіна адзначыла Дзень Незалежнасці. У Беларусі (зрэшты, як і ў любой іншай краіне) гэты дзень выконвае ў першую чаргу сакральную функцыю, бо падзяляе гісторыю на дзве нераўназначныя і супрацьпастаўленыя адна адной часткі: на тую, што была «да таго», і на тую, з якой, уласна, усё і пачалося.

У беларусаў усё пачалося з дня вызвалення Мінска ад фашыстаў у ліпені 1944 года. Сваё права на такую кропку адліку яны зацвердзілі на лістападаўскім рэферэндуме 1996 года. А каб ніхто не сумняваўся ў яго выніках, у будынак ЦВК загадзя былі накіраваныя невядомыя ўзброеныя людзі пад аховай міліцыі, якія і правялі неабходныя кадравыя перастаноўкі ў Цэнтральнай выбарчай камісіі. Тэарэтычнае ж абгрунтаванне пераносу нацыянальнай кропкі адліку даў кіраўнік дзяржавы: «Не ўсе ведаюць і памятаюць, што ў часы засілля нацыяналістаў галоўным дзяржаўным святам беларусаў быў іншы дзень, звязаны з развалам Савецкага Саюза. Такім чынам, ідэйныя нашчадкі фашысцкіх памагатых ставілі ў адзін шэраг нацысцкую Германію і Савецкі Саюз».

Але не варта настолькі важнае рашэнне тлумачыць выключна капрызам пэўнай асобы. Гэта асоба ведала, што рабіла. Зразумела, да афіцыйных вынікаў галасавання па згаданым пытанні (88%) варта ставіцца без фанатызму. У той лёсавызначальны дзень гэтак жа актыўна беларусы выказаліся супраць свайго права абіраць кіраўнікоў мясцовых органаў выканаўчай улады (70%), а таксама не пагадзіліся з тым, што фінансаванне ўсіх галін улады павінна ажыццяўляцца галосна і толькі з дзяржаўнага бюджэту (66%). Чаго не здараецца, калі кадравыя перастаноўкі робіцца невядомымі людзьмі ў цывільным пад аховай міліцыі...

Тым не менш не здзіўлюся, калі большасць беларусаў рашэнне пра сумяшчэнне Дня Незалежнасці з днём вызвалення Мінска падтрымала. Беларускае грамадства шмат у чым усё яшчэ застаецца савецкім, і перамога ў Вялікай Айчыннай вайне з'яўляецца для яго адзінай пазітыўнай апорай нацыянальнай самасвядомасці, таму што народ, задушаны галечай і самаўпраўствам начальства, велічны выключна ў часы максімальнай пагрозы.

Агульная пагроза ламала перагародкі саслоўнага грамадства, а савецкае грамадства, нягледзячы на марксісцкую рыторыку, было пабудавана выключна па саслоўным прынцыпе. Інакш дзяржава папросту не змагла б вызначыць, каму якая пайка належыць. Так узнікала ілюзія агульнанароднага яднання, пра якое ветэраны ўзгадваюць да гэтага часу.

Калі народы Еўропы штогод адзначаюць дзень заканчэння вайны і наступленне міру, то савецкія беларусы святкуюць Перамогу. Гэта не проста перамога — гэта «Наша Перамога», якую мы нікому не аддадзім. Доўгія гады пад «нашымі» разумелася дружная сям'я народаў СССР (цікава, а дэпартаваныя ў гады вайны народы ўваходзілі ў лік дружных?), сёння ж кола «нашых» афіцыйная прапаганда ўсё часцей рэдукуе да беларусаў. Адсюль, дарэчы, і імкненне атрымаць з еўрапейскіх народаў палітычныя і эканамічныя дывідэнды за вызваленне ад «карычневай чумы».

Зразумела, што плюралізм меркаванняў не з'яўляецца моцным бокам аўтарытарнай улады. Яна здольная існаваць толькі ва ўмовах адной Праўды, ва ўмовах адзінага народа, згуртаванага вакол першай асобы дзяржавы. Такому адзінству варта паўстаць ужо хаця б таму, што ніякіх самастойных крыніц для згуртавання ў самога народа няма і быць не павінна. Усе, хто думае інакш, у тым ліку і з нагоды «Нашай Перамогі», — адмарозкі, якія хочуць пазбавіць народ гераічнага мінулага, імкнуцца адрэзаць яго ад гістарычных каранёў (у больш глыбокія гістарычныя пласты афіцыйныя карані, мяркуючы па ўсім, прарасці не ў стане). Словам, іншую, адрозную ад афіцыйнай інтэрпрэтацыю вайны варта разглядаць як замах на святыню, як абразу памяці загінулых.

Перамога дапамагае знайсці адказы і на выклікі сучаснасці, аднак далёка не кожны беларус здольны на прадуктыўны пошук, а толькі той, хто з'яўляецца законным спадчыннікам «вялікага подзвігу савецкага народа». Падзел беларусаў на законных і незаконных спадчыннікаў — прамы абавязак ідэалагічнай «вертыкалі». Калі меркаваць па нядаўнім інтэрв'ю Лукашэнкі расійскім СМІ, інвентарызацыя беларусаў «вертыкаллю» паспяхова завершаная. «Адмарозкаў» апынулася няшмат: «няхай 2, няхай 3 працэнта».

## Выпрабаванне мірам

Савецкае грамадства, як, зрэшты, і грамадства дасавецкае, магло існаваць выключна ва ўмовах сталай мабілізацыі. Галоўным мабілізуючым фактарам пры гэтым выступаў вобраз ворага. Калі я быў школьнікам, як і мільёны маіх аднагодкаў, рэгулярна пісаў сачыненні пад агульнай назвай «*С одного металла льют медаль за бой, медаль за труд*». Пра што гэта кажа? Перш за ўсё пра тое, што мяжа паміж мірнай і ратнай працай у тыя гады была вельмі ўмоўнай. Вялікая Айчынная вайна скончылася ў 1945 годзе, але ўтрыманне войска па-ранейшаму паглынала каля паловы ВУП, а значыць лозунг "Усё для фронту, усё для Перамогі!" ніхто не адмяняў.

Саюз народа і ўлады, які дастаўся нам у спадчыну, не раз праходзіў паспяховае выпрабаванне вайной. Праблемы, як правіла, пачыналіся ў мірны час. Калі вораг па нейкай прычыне марудзіў, то яго даводзілася выдумляць, інакш саюз пачынаў распаўзацца, падобна коўдры з лапікаў.

Незалежнай Беларусі ў гэтым плане дасталася цяжкая спадчына. Рэальна ваяваць ніз кім не можа, дый час баявых дзеянняў на еўрапейскім кантыненце мінуў. Сёння адчыненыя межы, лёгка пранікальныя для працоўнай сілы, і народ пачынае «галасаваць нагамі» як толькі адчуе, што дзесьці хтосьці плаціць больш, чым родная дзяржава. Балазе, сусветны крызіс часова стрымаў адток працоўнай сілы, але ж часова.

У «малочнай вайны» паміж Беларуссю і Расіяй, якая ўспыхнула ў чэрвені, ёсць шмат тлумачэнняў. Любая сацыяльная рэальнасць складаней за нашы ўяўленні пра яе, але, як паказвала практыка, канфлікты, што перыядычна пераходзяць у «войны» ў рамках Саюзнай дзяржавы, ёсць не адхіленне ад нормы, а яе сістэмаўтваральны элемент. Ужо каму як не сапраўдным спадчыннікам Перамогі варта ведаць пра гэта.

АПЫТАННЕ

# КРЫЗІС НАС НЕ ХВАЛЮЕ

Алена Запалянская

**Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў, зарэгістраваны ў Літве, правёў у чэрвені чарговае апытанне грамадскай думкі.**

## Крызіс

Беларусаў крызіс ужо не так хвалюе, як у сакавіку. Так, калі ў сакавіку быў зафіксаваны ўсплёск тых, хто заўважыў пагаршэнне свайго матэрыяльнага становішча (63%), то ў чэрвені гэта лічба паменшылася ўдвая. Затое на 7% павялічылася колькасць тых, хто верыць, што Беларусь ідзе ў правільным накірунку. А вось лічба тых, хто думае, што ў няправільным, — практычна не змянілася: 34,9% — у сакавіку, 33,6% — у чэрвені. У той жа час, колькасць рэспандэнтаў, якія лічаць, што ў краіне ўсё добра, дасягнула рэкорднага паказчыка за апошнія два гады — 54,6%. У спакойную палітычную абстаноўку вераць 47,7% беларусаў ад 18–29 гадоў і 67,8% старэйшых за 60 гадоў. Падобна, што для беларусаў крызіс ужо закончыўся.

## Верым у стабільнасць

Рэйтынг Аляксандра Лукашэнкі трохі падрос — да 40,9% (з сакавіка на 1,7%). Аднак, каля 10% тых, хто давярае Аляксандру Лукашэнку, галасаваць за яго пакуль не плануюць.

Дзяржаўныя і недзяржаўныя СМІ атрымалі амаль роўную ступень даверу, з невялікай перавагай незалежных (44,7 і 45,3%). Дарэчы, калі не ўлічваць узрост, жанчыны больш вераць дзяржаўным СМІ (52,4%), а мужчыны падтрымліваюць недзяржаўныя — 46,9%.

## Расія і Еўрасаюз

На пытанне "Калі б цяпер у Беларусі праводзіўся рэферэндум па пытанню, ці ўступаць Беларусі ў Еўрасаюз, якім быў бы ваш выбар?" станоўча адказалі 41,4% адмоўна — 39,8%. Гэта, па інфармацыі НІСЭПД, гістарычны максімум "еўрапейскіх настрояў беларусаў".

Калі супаставілі Еўропу і Расію, адразу стаў заўважны раскол беларусаў. Прарасійскі і праеўрапейскі накірунак падтрымліваюць прыкладна аднолькавая колькасць людзей — 42,1 і 41,4%.

Праўда, усё больш беларусаў думаюць, што ў пагаршэнні становішча вінаваты менавіта Захад (з сакавіка лічба ўзнялася на 3% і дасягнула максімуму ў 36,2%). Пры гэтым надзеі на выхад з крызісу беларусы звязваюць менавіта з замежнымі інвестыцыямі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# БІТВА ЗА КАМБАЙНЫ

Вольга Хвоін

**Пасля малочнага скандалу паміж Беларуссю і Расіяй пакрысе разгараецца канфлікт у сферы гандлю сельскагаспадарчай тэхнікай. Улічваючы папярэдні досвед гандлёвай вайны, чыноўнікі не сталі чакаць, пакуль з іскры шугане полымя, а наладзілі перамоўны працэс.**

Штуршок канфлікту надала заява прэм'ер-міністра Расіі Уладзіміра Пуціна праверыць звесткі генеральнага дырэктара "Растсельмаша" Валерыя Мальцава аб "прыхаваным" імпарце беларускай сельгастэхнікі ў Расію. Мальцаў на нарадзе 6 ліпеня ў Растове-на-Доне заявіў, што беларускі завод "Гомсельмаш" пастаўляе тэхніку ў Бранск, дзе на машынах "мяняюцца этыкеткі, афармляюцца дакументы як на выробленыя ў Расіі, і потым на іх распаўсюджваюцца расійскія ільготы".

Урад Расіі выдзяляе субсідыі на набыццё расійскай сельгастэхнікі. Акрамя таго, дзейнічае рашэнне, паводле якога бюджэтныя сродкі можна накіроўваць на закупку сельгастэхнікі, выраблёнай у Расіі. Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што даступнасць рынкаў Расіі і Беларусі павінна быць раўназначная.

Афіцыйны прадстаўнік "Рассельмаша" Таццяна Закаблукава паведаміла, што Беларусь штогод пастаўляе на расійскі рынак больш за 1100 камбайнаў. Пры гэтым "Растсельмаш" фактычна пазбаўлены такой магчымасці, таму што "беларускі бок не выконвае кантрактныя абавязацельствы па закупцы расійскай тэхнікі". У прыватнасці, згодна з апошняй дамовай, Беларусь павінна была закупіць 200 камбайнаў, аднак закупіла толькі 30.

Па выніках беларуска-расійскіх перамоў аб узаемных пастаўках сельгастэхнікі, што прайшлі ў Мінску 8 ліпеня, было заяўлена, што краіны маюць намер скардынаваць свае намаганні па развіцці сельскагаспадарчага машынабудавання. "Мы дамовіліся, што суб'екты гаспадарання і асацыяцыя "Саюзаграмаш" падрыхтуюць прапановы, і ў жніўні яны будуць разгледжаныя на пасяджэнні сумеснай камісіі з удзелам прадстаўнікоў Мінпрамгандлю Расіі і Мінпрама Беларусі, будуць прынятыя адпаведныя рашэнні", — перадае Інтэрфакс словы намесніка міністра прамысловасці Беларусі Генадзя Свідэрскага.

Кіраўніцтва прадпрыемстваў мусіць дэталёва прапрацаваць пытанні вытворчых сувязей і дамоваў паставак, каб "тыя пытанні, якія патрабуюць рашэння на ўзроўні дзяржкіравання, былі сумесна вырашаныя Мінпрамам і Мінпрамгандлем". Намеснік міністра прамысловасці дадаў, што "ў нас ёсць саюзная праграма развіцця сельгасмашынабудавання, якая, напэўна, будзе дапоўненая. У выніку мы павінны даваць канкурэнтаздольную прадукцыю на рынках Беларусі і Расіі, а таксама пастаўляць яе ў трэція краіны". "Крыўдна, што беларуская тэхніка канкуруе з заявамі, што ёсць няроўныя меры доступу на расійскі і беларускі рынкі", — зазначыў Генадзь Свідэрскі.

Кіраўнік Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Сямён Шапіра ўвогуле лічыць заявы "Растсельмаша" пазбаўленымі "сялянскай мудрасці". Паводле яго слоў, кіраўніцтва "Рассельмаша" прапануе падзяліць рынак: не выпраляць у Беларусі збожжаўборачныя камбайны, а спецыялізавацца на кормаўборачнай тэхніцы. "Закрыць беларускую вытворчасць камбайнаў — гэта дурасць", — падкрэсліў міністр.

У абарону айчынных вытворцаў ён прывёў факт таго, што магутнасці вытворчасці "Растсельмаша" не здольныя забяспечыць патрэбы Расіі ў абнаўленні парку сельскагаспадарчай тэхнікі: "У Растове выпрабляецца чатыры тысячы камбайнаў. Мы палову гатовыя забраць з гэтага аб'ёму вытворчасці. Але што на Расію застанецца?" У планах Беларусі штогод мадэрнізаваць і замяняць да дзвюх тысяч камбайнаў. Чыноўнік лічыць, што закупкі сельскагаспадарчай тэхнікі ў Беларусі для Расіі выгодныя, бо апошняя набывае камбайны ў далёкім



замежжы па коштах, значна большых за беларускія. "Расія мусіць спрыяць беларускаму сельгасмашынабудаванню на расійскім рынку, гэта выгодна ў першую чаргу расіянам".

Вырашэннем спрэчных пытанняў і стварэннем роўных умоў беларускім і расійскім прадпрыемствам, якія займаюцца выпускам сельгастэхнікі, па доступу на рынкі краін-суседак займаецца сумесная група, у якую ўваходзяць прадстаўнікі беларускага Мінпрама і расійскага Мінпрамгандлю. У жніўні будуць вызначаныя мерапрыемствы навукова-тэхнічнай праграмы ўзаемнай кааперацыі, скаардынаваная стратэгія развіцця асноўных прадпрыемстваў — МТЗ, "Гомсельмаш", "Бабруйскаграмаш", расійскіх — "Рассельмаш" і карпарацыі "Трактарныя заводы".

ПАДАТКІ

# УВАГА НА ФІЗІЧНЫХ АСОБАЎ

Вольга Хвоін

**Пераход шэрагу прадпрыемстваў на няпоўны працоўны дзень спраўкаваў рост незаконнага прадпрымальніцтва. Пра гэта заявіў падчас прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік міністра па падатках і зборах Васіль Каменка.**

## Нелегалы таксуюць і стрыгуць

За пяць месяцаў гэтага года было выяўлена 10,5 тысячы фізічных асоб, якія займаліся прадпрымальніцкай дзейнасцю без рэгістрацыі. Гэта ў тры разы больш у параўнанні з мінулым годам. Амаль палова выяўленых "нелегалаў" — 42 працэнты — пасля папярэджанняў з боку падатковых органаў сталі на ўлік. За неадназовае парушэнне заканадаўства 2 019 грамадзян былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці. З іх дзяржава атрымала ў казну ў выглядзе штрафаў 882 мільёна рублёў.

Намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Васіль Каменка адзначыў, што пасля пераводу рабочых на шэрагу прадпрыемстваў на няпоўны працоўны дзень у іх з'явіўся вольны час, у які людзі імкнуцца падзарабіць. "Многія займаюцца падсобнай гаспадаркай і атрымліваюць дадатковы прыбытак са сваіх участкаў. І гэта добра, — лічыць чыноўнік. — Але многія выконваюць працу, звязаную з аказаннем паслуг".

Найбольш нелегальных прадпрымальнікаў у сферы транспартных паслуг, асабліва ў сталіцы. На другім месцы — выкананне будаўнічых работ, за імі ідзе зборка і рамонт мэблі, рамонт аўтамабіляў, паслугі цырульнікаў і нянек. Выяўляць падобныя выпадкі даволі складана, бо людзі звычай-



на ці размяшчаюць аб'явы пра аказанне паслуг у газетах, ці знаходзяць кліентаў праз сваіх знаёмых. Да таго ж неабходна даказаць, што чалавек займаецца прадпрымальніцкай дзейнасцю сістэматычна. Парушальнікаў, якіх злавілі ў першы раз, — папярэджваюць, у наступны раз заводзіцца пратакол аб адміністрацыйным парушэнні, і справу ўжо разглядае суд.

Дарэчы, з гэтага года фізічныя асобы змогуць падаваць дэкларацыі ў электронным выглядзе. У перспектыве з развіццём электроннай базы плацельшчыкаў падатковыя органы плануюць увогуле перайсці да выплаты падаткаў без запаўнення дэкларацый.

## Юрыдычных асоб падзеляць і падтрымаюць

Пільную ўвагу падатковых органаў да фізічных асоб намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Васіль Каменка патлумачыў дзейнасцю ўказа прэзідэнта № 689, паводле якога ўведзены мараторый на правядзенне праверак на прадпрыемствах.

Акрамя таго падаткавікі засяродзіліся на выяўленні ценявых аперацый з грашовымі сродкамі і таварамі. Як паведаміў намеснік міністра, было заведзена чатыры крымінальныя справы за заніжэнне падаткааб-кладаемага прыбытку. Найбольш штрафаў за парушэнне падатковага заканадаўства сплацілі будаўнічыя арганізацыі, лесапераапрацоўчыя і лесанарыхтоўчыя, прадпрыемствы нафтахімічнага комплексу.

Разам з тым намеснік міністра заўважыў, што ўмовы для вядзення бізнесу ў дзяржаве не пагаршаюцца, а, паводле яго меркавання, наадварот, многае робіцца для спрашчэння працэдур рэгістрацыі, падаткаабкладання і рэгулявання прадпрымальніцтва. Напрыклад, дзяржаўную фінансавую падтрымку за кошт сродкаў праграм падтрымкі малога бізнесу могуць атрымаць індывідуальныя прадпрымальнікі, аб'ём выручкі якіх за мінулы год не перавысіў 500 мільёнаў рублёў. З першага ліпеня пачала дзейнічаць адпаведная пастанова Савета міністраў № 863.

Права на дзяржпадтрымку таксама маюць мікраарганізацыі і малыя арганізацыі, гадавы аб'ём выручкі якіх ад рэалізацыі тавараў, работ, паслуг без уліку падатку на дабаўленую вартасць не перавышае, адпаведна, 2 мільярдаў і 14 мільярдаў рублёў. Фінансавая падтрымка прадстаўляецца ў выглядзе выдзялення фінансавых сродкаў на зваротнай аснове, льготных крэдытаў, маёмасці на ўмовах лізінгу, кампенсавання часткі расходаў, звязаных з удзелам у выставачна-кірмашовых мерапрыемствах або з іх арганізацыяй, кампенсавання часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі. Абавязковай умовай для атрымання фінансавай падтрымкі на конкурснай аснове з'яўляецца стварэнне на прадпрыемстве новых працоўных месцаў.

Новаўвядзенні ў дачыненні да юрыдычных асобаў з'явяцца і ў галіне падаткаабкладання. Міністэрства па падатках і зборах падзеліць усіх юрыдычных плацельшчыкаў на групы рызыкі па нявыплаце падаткаў. Гэта прадугледжана праектам указа аб кантрольнай дзейнасці, які зараз распрацоўваецца. Усе суб'екты гаспадарання будуць падзеленыя на тры групы рызыкі. На прадпрыемствах, якія трапілі ў групу высокай рызыкі, падатковыя інспектары будуць заходзіць не часцей за адзін раз на год. Прадпрыемствы з другой групы і адпаведна з большым узроўнем даверу будуць правяраць не часцей за адзін раз на тры гады. Самыя надзейныя змогуць чакаць праверак не часцей за адзін раз на пяць гадоў ці ўвогуле кантрольныя органы правяраць іх не будуць.

Праектам указа таксама прадугледжваецца, што толькі зарэгістраваныя прадпрыемствы вызваляць ад усіх праверак на тры гады. Толькі выключныя выпадкі могуць стаць нагодай для пазапланавых праверак новастворанных прадпрыемстваў. Важна дадаць, што паводле новага ўказу нарматыў праверак будзе тычыцца не толькі падатковых, але і ўсіх кантралюючых органаў.

## Мінус на плюс

Намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Васіль Каменка паведаміў, што агулам падатковая нагрузка ў частцы плацяжоў, якія кантралююцца падатковымі органамі, у першым паўгоддзі склала 30,1 працэнта да валавога ўнутранага прадукту. Летась гэты паказчык быў на ўзроўні 36 працэнтаў.

Для далейшага паніжэння падатковай нагрузкі разглядаецца магчымасць адмены збору ў фонд падтрымкі сельскагаспадарчых вытворцаў у памеры аднаго працэнта, а таксама змяненне стаўкі падатку на прыбытак з 24 да 20 працэнтаў. Каб кампенсаваць паступленні грашовых сродкаў у бюджэт, прапануецца павялічыць стаўку падатку на дабаўленую вартасць з 18 да 20 або 22 працэнтаў.

ПРАФЕСІЯ

# ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ МАЛАДЫМ НАСТАЎНІКАМ

Юлія Снег

**Як працуецца паводле размеркавання тым, хто мусіць адпрацаваць 2 гады на карысць дзяржавы? Ці пакідае досвед працы ў школе жаданне працягваць прафесійную дзейнасць у гэтым кірунку? Ці працуюць правы маладых спецыялістаў на практыцы? Пра школьныя будні маладых настаўнікаў разважаюць героі публікацыі.**



## Геаграфія — без глобуса

Аксана скончыла Педагагічны універсітэт імя М. Танка. Спецыяльнасць рэдкая, цяпер такой няма — геаграфія, беларуская мова і літаратура. Адправілася працаваць у Каралёў Стан, што ў рысе Мінску, але на ўскрайку. Першы выкладчыцкі год для дзяўчыны стаўся няпростым выпрабаваннем. Па-першае, школа настолькі бедная, што выкладаць даводзіцца літаральна на пальцах. Няма глобусаў, няма мапаў. Бракуе падручнікаў, літаратуры для пазакласнага чытання.

Высілкі настаўніцы навучыць не зважаючы на недахоп падручных сродкаў вучні цэняць мала — адбіваецца кантынгент. Атрымліваецца так, што бацькі, якія сур'ёзна заклапочаныя адукацыяй уласных дзяцей, стараюцца ўладкаваць іх у мінскія школы. А ў самім Каралёвым Стане застаюцца дзеці з не надта ўдалых сямей. Каго дома не вельмі даглядаюць, не дужа песцяць, не імкнуцца кантраляваць. Абазнанасць дзяцей у самых простых побытавых рэчах спачатку Аксану проста бянтэжыла: "Я сама вырасла ў вёсцы, як і мае вучні. Але яны не ведаюць такіх рэчаў, што проста дзіву даешся. Прыкладам, нядаўна высветліла, што яны не ўяўляюць сабе, як спявае шпак. Дзякуй Богу, ведаюць, як ён выглядае. Здзіўляе, што ж яны заўважаюць у жыцці, якое вакол іх?"

Як малады спецыяліст, Аксана наведвае адкрытыя ўрокі, якія даюць яе вопытныя калегі: "Настаўнікі з вялікім досведам працы даюць розныя тэматычныя ўзорныя ўрокі і нас, маладых спецыялістаў, вучаць. Канечне, гэта па адмысловым сцэнары ўрокі, ды вучні там добрыя, ды і досвед працы ў людзей — у каго 20 гадоў, а ў каго і болей. Але ўсё адно, калі глядзіш на гэтыя ўрокі — гэта акрыляе, хочацца імкнуцца да лепшага, несці добрае, светлае. А потым вяртаешся да сябе, глядзіш на сваіх дзетак, каму абсалютна нічога не патрэбна… Апускаюцца рукі".

## Настаўнік недаглядзеў

У маёй суразмоўцы Наталлі рукі апусціліся значна раней за сканчэнне тэрміну адпрацоўкі ў школе. Яна выкладала англійскую мову. На яе погляд, атмасфера працы настаўніка на сённяшні дзень папросту прыніжае яго прафесійную і чалавечую годнасць штодзень. І справа нават не ў мізэрных заробках (а ў маладых спецыялістаў заробкі самыя маленькія).

"Звычайны настаўнік — як паміж молатам і кавадлам — знаходзіцца паміж адміністрацыяй школы і бацькамі. На мне — цалкам адказнасць за дзяцей, хаця я з імі праводжу ў лепшым выпадку акадэмічную гадзіну ўдзень. Асабліва страшна сёння браць на сябе класнае кіраўніцтва — грошай гэта дадае дробязь, а нерваў ты напэўна пазбавішся на дзесяцігоддзе за паўгады", — кажа Наталля. І ілюструе тэорыю выпадкам з практыкі: "Хлопчык-шасцікласнік скраў шакаладку ў краме. Яго паставілі на ўлік у міліцыі. Гэта здарылася ў верасні, маёй былой аднакурсніцы толькі-толькі даручылі класнае кіраўніцтва — пачатак школьнага года. А ў студзені з яе на 100 працэнтаў знялі прэмію. Бо нібыта гэта яе віна: яна недавыхавала, яна недагледзела, яна недастаткова ўвагі аддала як класны кіраўнік".

Усевінаватасць настаўніка выхоўвае ў дзецях усёдазволенасць. "Былі выпадкі, калі дзеці, якіх настаўнікі выганялі з класа за хамскія паводзіны з традыцыйным запісам у дзённік "Заўтра ў школу з бацькамі" прыходзілі з раз'юшанымі бацькамі, маўляў, дзіця паскардзілася, што вы на ўроках лаецеся матам і што вы яго білі.

Нават адказнасць за прагулы вучня перакладзена з бацькоў на настаўніка і таксама можа стаць нагодай для пазбаўлення прэміі. Таму настаўнік сам мусіць выпраўляць сітуацыю. "Хлопец у школу не хадзіў наогул. Бацькі сыходзілі на працу раней, чым па часе трэба ў школу яму. І ён проста не наведваў заняткі. Бацькі распісваліся ў бездапаможнасці. Ніякія ўгаворы таксама не працавалі. Мне даводзілася па яго заязджаць перад працай. Не кожны дзень ён мне дзверы адчыняў, праўда. Але час ад часу шанцавала — і тады мы з ім, сямікласнікам, за ручку ехалі ў школу разам", — расказвае Наталля.

## За правы можна змагацца

Паводле закону, пазбаўляць маладога спецыяліста прэміі нельга. Але прыклад сяброўкі адбіў у Наталлі жаданне змагацца за свае правы: "Два прыклады мне хапіла. Сяброўка мае такі характар, што не змаўчыць, калі незаконна нешта ды несправядліва. Так, прэмію ёй вярнулі. Але папросту пачалі даставаць штодзённымі праверкамі, хамствам, прэтэнзіямі на пустым месцы. Напрыклад, дырэктарка рэгулярна выкарыстоўвала гэткія абароты: "Ды вы паглядзіце на сябе, мне не падабаецца, як вы выкладаеце, гэта не ваша, нашто пайшлі ў гэтую сферу. Вы не ўмееце вучыць, вы не любіце дзяцей…" А малады хлопец-фізік, які таксама прыйшоў па размеркаванні, неяк на лятучцы ў абарону яе сказаў два словы. Дык яго давілі да таго, што на "Хуткай дапамозе" забіралі — сэрца прыхапіла".

Між тым, сёлета выпускнікі ВНУ, чыя спецыяльнасць можа быць звязана з выкладчыцкай дзейнасцю, сутыкнуліся з вялікім дэфіцытам вакансій. Прыкладам, у Лінгвістычным універсітэце дэфіцыт месцаў для размеркавання прывёў да таго, што выпускнікоў адпраўляюць у дзіцячыя садкі. Хаця такога прадмету — выкладанне ў дашкольных установах — у праграме не было. А тым часам у Пастанове аб размеркаванні ёсць пункт 20, паводле якога пры адсутнасці месцаў для размеркавання, адпаведных атрыманай спецыяльнасці паводле дыплома, выпускніку павінны даць "вольны" дыплом.

ДЗЕЦІ

# ЗДАРОЎЕ НАЦЫІ ПАД ЗАБАРОНАЙ

Вольга Лісічонак

**Напрыканцы чэрвеня ў афіцыйнага Мінска ўзніклі праблемы яшчэ з адной краінай, дзе праходзілі аздараўленне дзеці з Чарнобыльскай зоны, — з Канадай. Прычына ўсё тая ж — беларускія ўлады сцвярджаюць, што прымаючы бок не жадае забяспечваць моцныя, юрыдычна завераныя гарантыі вяртання беларускіх дзяцей на радзіму. Канадскае ж МЗС настойвае на тым, што яно не толькі падрыхтавала адпаведны пакет пагадненняў, але і пераслала паперы ў Беларусь. Аднак ніякіх заўваг па ім чамусьці не паступіла.**

Між тым, па дадзеных Сацыяльна-эканамічнага аб'яднання "Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў", у Беларусі няма ніводнага раёна, дзе б радыяцыя не ўплывала на насельніцтва. Пад асаблівай жа пагрозай беспераппыннага выпраменьвання знаходзяцца дзеці. Так, у Мінску ахвярай радыяцыі лічыцца кожнае трэцяе дзіця, у Горацкім раёне — двое з трох; у астатніх раёнах няма ўвогуле ніводнага малога, які б не пацярпеў ад радыяцыі. Па дадзеных эксперта па экалагічнаму менеджменту Беларускага камітэта "Дзеці Чарнобыля" Тамары Белавокай, у краіне афіцыйна зарэгістравана 14 тысяч выпадкаў рака шчытападобнай залозы. Па статыстыцы сярэднегадавы тэмп росту захворванняў новаўтварэнняў у лімфатычнай і крывятворнай тканінах і пухлінаў галаўнога мозгу ў дзяцей складае 20 працэнтаў. У параўнанні з 1994 годам першаснае захворванне новаўтварэннямі на 100 тысяч дзяцей у Беларусі павялічылася ў тры разы.

Кіраўнік цэнтра "Падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў" акадэмік Іван Нікітчанка ўсялякія намаганні на прыпыненне міжнародных дзіцячых аздараўляльных праграм называе "антынароднымі", "антыканстытуцыйнымі" і "антызаконнымі". Паводле меркавання старшыні Беларускага дабрачыннага фонду "Дзецям Чарнобыля" прафесара Генадзя Грушавога, афіцыйны Мінск сваім Указам № 555, фактычна зрабіў 30 тысяч беларускіх дзяцей закладнікамі. Сітуацыі па невяртанні дзяцей — адзінкавыя выпадкі, у той час, як карысць ад іх — масавая.

Канфлікт з Канадай — не першы падобны выпадак у міжнароднай практыцы Беларусі. Прыкладна ў такім ключы афіцыйныя ўлады раней вялі размову з Германіяй, Нідэрландамі, Італіяй, Ірландыяй. Чаму ўлады так настойліва перашкаджаюць выезду беларускіх дзяцей за мяжу? Афіцыйная пазіцыя такая: выпадкі з Вікай Мароз і Таццянай Казыра — небяспечны прэцэдэнт у міжнароднай практыцы.

Нагадаем, што 5 жніўня 16-гадовая беларуска Таццяна Казыра не вярнулася на радзіму разам з усёй сваёй групай. Пазней стала вядома, што дзяўчына падала ў іміграцыйную службу ЗША дакументы для працягвання гасцявой візы. Тады для сустрэчы з Таняй у ЗША вылецеў супрацоўнік МЗС Беларусі Павел Шыдлоўскі. З дзяўчынай чыноўнік сустрэўся, аднак тая адхіліла прапанову пра вяртанне на радзіму. Але ўжо 23 жніўня Казыра ў Мінск усё ж вярнулася, бо "моцна сумавала па старэнькай бабулі", адзінай апякунцы дзяўчыны.

Да гэтага маленькую Віку Мароз яе італьянскія апекуны катэгарычна адмовіліся вяртаць назад у інтэрнат, бо заўважылі на малой сляды пабояў і катаванняў. Беларускі бок, што адметна, і ў першым, і ў другім выпадку дзейнічаў вельмі груба, без асаблівага ўваходжання ў падрабязнасці справы. Як вынік: забарона на выезд за мяжу для многіх тысяч дзяцей.

Чаму беларускія ўлады так дзіўна сябе паводзяць, адмаўляючы ўласным дзецям у праве быць здаровымі? Чаму ставяць такія дзіўныя абмежаванні па ўзросту (да 14 год) і па колькасці наведванняў краіны (да трох разоў)? Эксперты сцвярджаюць, што справа тут далёка не ў Віцы Мароз і Тані Казыры.

Па словах Генадзя Грушавога, улады не спрыюць ажыццяўленню праграм дапамогі ахвярам Чарнобыльскай катастрофы, таму што "ўсе гэтыя праграмы здзяйсняе грамадскі сектар. Дзяржава толькі кантралюе. Кантраляваць, рэгуляваць і, пры неабходнасці, забараняць — вось што рабіла дзяржава па гэтых праграмах у апошнія гады". Як падкрэслівае Генадзь Грушавы, "дзяржава такога кшталту, як наша, заўжды імкнецца да манаполіі на сацыяльную абарону народа, таму што сацыяльная абарона, сацыяльная падтрымка — гэта галоўны інструмент уплыву на грамадскую свядомасць. Калі дапамагае не дзяржава, а нейкія іншыя структуры, яны для людзей аб'ектыўна з'яўляюцца альтэрнатывай дзяржаве".

Другая прычына, якую называюць спецыялісты, заключаецца ў тым, што пры захаванні масавага выезду дзяцей за мяжу можа стацца так, што хутка няма каму будзе глядзець перадачы БТ пра "загніваючы Захад". У сваёй кнізе "Ціхая рэвалюцыя дзяцей Чарнобыля" былы дэпутат Бундэстагу прафесар Эрык Шухард распавядае, як маленькі хлопчык, пабачыўшы жыццё ў іншай краіне, запытаўся ў бацькоў: "Тата, ты не паліш цыгарэты, не п'еш гарэлку, маці працуе, як немцы, з раніцы да вечара. Мама, тата, чаму гэта мы жывем дрэнна, а немцы жывуць добра?" Пытанні дзіцёнка адназначна пагражаюць палітычнай стабільнасці унікальнага беларускага шляху развіцця.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што для насельніцтва Беларусі праблемай нумар адзін, важней за якую няма, застаецца абарона ад радыяцыі, чакаць нейкіх зрухаў у сённяшняй сітуацыі не варта.

## 17 ЛІПЕНЯ, ПЯТНІЦА

**05.35** Камедыйны серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05, 13.55** "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
**09.10** Дакументальна-біяграфічны цыкл "Мая праўда" (Украіна). Фільм "Барыс Майсееў. Птушачка".
**10.05** Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці" (Украіна).
**10.50** Меладраматычны серыял "Два бакі адной Ганны" (Украіна).
**11.35** "OFF STAGE LIFE".
**12.10** Фантастычны серыял "Эўрыка" (ЗША).
**13.05** Фантастычны серыял "Героі" (ЗША).
**14.05** Відэафільм "Парніковы перыяд".
**14.30** Камедыйны серыял "Клініка" (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вострасюжэтны серыял "Двое з куфара" (Расія).
**16.30** Жаночае ток-шоў "Жыццё як жыццё". "Маё дзіця і яго грошы".
**17.35** Меладраматычны серыял "Два бакі адной Ганны" (Украіна). Заключная серыя.
**18.35** "Зона Х". Вынікі тыдня.
**19.30** «Славянскі базар у Віцебску-2009». Барыс Майсееў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Фантастычны серыял "Зорны крэйсер "Галактыка" (ЗША- Вялікабрытанія).
**23.30** Драма "Туляга" (Югаславія).
**01.20** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе : "Наша раніца".
**09.05** "Рудая". Шматсерыйны фільм.
**10.05** "Бурштынавы барон". Шматсерыйны фільм. Расія, 2007 год.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** "Кантрольны закуп".
**11.40** "Ералаш".
**12.00** "Малахаў+".
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** "Зразумець. Прабачыць".
**13.45** "Модны прысуд".
**14.45** "Жадаю ведаць" з Міхаілам Шырвіндтам.
**15.10** "Гарачы лёд". Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** "Прынцэса цырка". Шматсерыйны фільм.
**17.10** "Хай кажуць" з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня». Амедыя (Расія) пры ўдзеле Соні Пікчерс (ЗША), 2004 год.
**19.00** "Поле цудаў".
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Надзея Бахціна, Барыс Шчарбакоў у фільме "Чацвёртая група".
**23.20** Вэл Кілмер у фільме "Грымотнае сэрца".
**01.25** Нашы навіны.
**01.40-01.50** Навіны спорту.

**06.00** "24 гадзіны".
**06.10** "Міншчына".
**06.20** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**07.30** "24 гадзіны".
**07.40** "Раніца. Студыя добрага настрою".
**08.30** "Аўтапанарама".
**08.50** "Кобра. Антытэрор". Серыял.
**10.00** "Пяць гісторый".
**10.30** "24 гадзіны".
**10.40** "Танга ўтрох". Тэленавела.
**11.30** "Далёкія сваякі".
**11.45** "Званая вячэра".
**12.35** "Шырокая рака". Серыял.
**13.30** "24 гадзіны".
**13.50** "Добры дзень, доктар!".
**14.20** "Дарагая перадача".
**14.40** "Гадкае качаня". Моладзевы серыял.
**15.30** "Крот". Серыял.
**16.30** "24 гадзіны".
**16.50** "Новыя вандраванні дылетанта".
**17.20** "Міншчына".
**17.30** "Званая вячэра".
**18.30** "Шырокая рака". Серыял.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** "Сталічныя падрабязнасці".
**20.10** "СТБ-спорт".
**20.15** "Добры вечар, маляня".
**20.30** "Камедыя па пятніцах": "Школа нягоднікаў".ЗША, 2006г.
**22.30** "24 гадзіны".
**22.55** "СТБ-спорт".
**23.00** Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.40** "Для тых, хто не спіць": "Закінуты дом". Вялікабрытанія-Іспанія-Балгарыя, 2006г.
**01.10** "Уцёкі". Серыял.

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Турэцкага" (Расія).
**09.00** У гэты дзень.
**09.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.55** Час футбола.
**10.25** Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
**11.10** Серыял "Два лёсы" (Расія).
**12.05** Моладзевы дэтэктыўны серыял "Вераніка Марс-2" (ЗША).
**12.50** Жаночая ліга.
**13.15** Гіпноз.
**14.00** Школа рамонту.
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.00** «Славянскі базар у Віцебску-2009». Дзіцячы конкурс. Гала-канцэрт.
**16.35** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**17.35** Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
**18.15** Пасоўванне+.
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дакументальны фільм "Панна Марыя з Ражкоўкі" (Беларускае тэлебачанне).
**19.15** Бітва экстрасэнсаў.
**20.15** Калыханка.
**20.35** Экспедыцыя.
**20.40** Авантурная камедыя "Руская гульня" (Расія).
**22.25** "Іншыя". Псіхалогія крыміналу.
**22.50** Крымінальная камедыя "Два стромкіх хлопца" (Іспанія).

**РОССИЯ**

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.25** Тэлесерыял «Кармеліта».
**11.00** Весткі.
**11.25** Руская серыя. "Майстар і Маргарыта". Тэлесерыял.
**12.25** Тэлефільм «Хаджэнне па пакутах». 5-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**15.15** "Гарадок". Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.50** "Раман з Карцавым. Журботны блазан". Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** "Кулагін і партнёры".
**17.55** "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**21.20** "Юрмала". Міжнародны фэст гумарыстычных праграм.
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** Урачыстая цырымонія закрыцця Міжнароднага фэсту "Славянскі базар у Віцебску".
**00.50** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
**08.00** Сёння.
**08.05** "Масква-Ялта-транзіт".
**09.40** "Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне".
**10.00** Сёння.
**10.20** "Прафесія - рэпарцёр".
**10.50** "Шнур вакол свету".
**11.20** Вострасюжэтны серыял "Псеўданім "Албанец-2".
**12.05** "Сярэдні клас".
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Мухтара-2".
**15.10** Серыял "Аэрапорт".
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял "Вуліцы разбітых ліхтароў-7".
**18.15** "Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне".
**18.30** "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
**19.00** Сёння.
**19.35** "Следства вялі...".
**20.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Дарожны патруль-2".
**22.40** Прэм'ера. Крымінальна-псіхалагічны трылер "Наркоз".
**00.15** Крымінальная драма "Помста Крысці".
**01.50** Музычная камедыя "Давайце кахаць".

**EUROSPORT**

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**10.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Танэрэ - Вітэль. Францыя. Этап 12. Агляд.
**11.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 1 метр. Папярэднія спаборніцтвы. Рым (Італія).
**14.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Танэрэ - Вітэль. Францыя. Этап 12.
**15.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Вітэль - Кальмар. Францыя. Этап 13.
**18.30** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 1 м. Фінал. Рым (Італія).
**20.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Жанчыны. 10 м. Папярэднія спаборніцтвы. Рым (Італія).
**21.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Навіны.
**21.15** Самыя дужыя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Славакія.
**22.15** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 1 м. Фінал. Рым (Італія).
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Вітэль - Кальмар. Францыя. Этап 13. Агляд.
**00.00** Боўлінг. Кубак свету. Мужчыны. Мексіка. Фінал.
**01.00** Лодкавы спорт. Чэмпіянат свету. Клас Р1. Стамбул (Турцыя).
**01.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Вітэль - Кальмар. Францыя. Этап 13.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**19.00** Аб'ектыў
**19.05** Дакументальная гадзіна: «Галерэя Ады», дак. фільм, рэж. Уладзімір Колас, 2007 г., Беларусь
**20.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў, 4 серыя: «Гуманітарная палітыка»
**20.20** Беларусы ў Польшчы
**20.35** Госць «Белсату»: Павел Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі і палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Альгерд».
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.20** «Костка», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**22.45** Аб'ектыў

## 18 ЛІПЕНЯ, СУБОТА

**06.25** Моладзевы серыял "Сэрца акіяна" (Францыя).
**06.50** Брытва Акама.
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.10, 12.15** "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
**09.15** Здароўе.
**09.45** Камедыйны серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
**10.10** Дакументальна-біяграфічны цыкл "Мая праўда" (Украіна). Фільм "Надзея Румянцава. Падарыць надзею".
**11.05** Ранішняя хваля.
**11.45** "OFF STAGE LIFE" з Іванам Айплатавым.
**12.20** Лірычная камедыя "Выйсці замуж за капітана" (СССР).
**14.00** Відэафільм АТН "Мелодыі кубінскіх кварталаў".
**14.25** Будні чэмпіёнаў.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.40** Вакол планеты.
**16.20** "Зона Х". Вынікі тыдня.
**16.40** Дакументальны цыкл "Зорнае жыццё" (Украіна). Фільм "Бацькі зорак, або Як выхаваць знакамітасць".
**17.40** Відэафільм АТН "Іўеўскія колеры" цыкла "Зямля беларуская".
**18.20** "Ваша лато".
**19.10** Латарэя "Пяцёрачка".
**19.20** «Славянскі базар у Віцебску-2009». Надзея Кадышава і ансамбль "Залатое кольца".
**21.00** Панарама.
**21.35** Відэафільм АТН "Прабач мяне".
**22.05** Іранічная камедыя "Эд Вуд".
**00.15** Уласнай персонай.

**07.00** АНТ прадстаўляе : "Суботняя раніца".
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** "Шчаслівыя разам". Камедыйны серыял.
**09.40** "Здароўе".
**10.25** "Смак".
**11.05** Камедыя Ўладзіміра Меньшова "Каханне і галубы".
**13.00** Прэм'ера. "Андрэй Грамыка. "Спадар НЕ".
**14.00** Фільм "Успаміны сэрца".
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Суботні "Ералаш".
**16.45** Прэм'ера. Сучаснае беларускае кіно "Пакуль мы жывыя".
**18.45** "Асабістае жыццё доктара Селіванавай". Шматсерыйны фільм.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе : "Новыя галасы Беларусі" на "Славянскім базары" у Віцебску.
**23.20-01.15** Біл Мюрэй у камедыі "Добрахвотнікі нехацця".

**06.50** "Турысты". Камедыйны серыял.
**08.20** "Сямейнае кіно": "Як каваль шчасце шукаў". Украіна, 1999г.
**09.40** "Я - вандроўца".
**10.05** "Крокі да поспеху" з Алінай Кабаевай.
**10.55** "Мінск і мінчукі".
**11.30** "Новыя вандраванні дылетанта".
**12.00** "Салдаты. Залатыя серыі".
**14.50** "Дарагая перадача".
**15.15** "Рэальны спорт".
**15.30** "Ваенная таямніца" з Ігарам Пракапенкам.
**16.20** "Наша справа".
**16.30** "24 гадзіны".
**16.40** Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** "Рэпарцёр СТБ". Лепшае.
**17.50** "У парадната пад'езда" з Кацярынай Забенько. Футбольны манеж.
**18.20** "Залатая калекцыя": "Супрацьстаянне". СССР, 1985г. 3-я серыя.
**19.30** "24 гадзіны".
**20.00** "СТБ-спорт".
**20.10** "Сусветны блокбастар": "Дыска". Францыя, 2008г.
**22.10** "Міхаіл Задорнаў. Адказ рабром".
**23.35** "Арт-хаўс": фільм рэжысёра Акіры Курасава "Яшчэ не". Японія, 1993г.
**01.55** "Уцёкі". Серыял.

**08.10** Мультсерыял "Мышка Марго" (Вялікабрытанія). 1-я і 2-я серыі.
**08.30** Дакументальна-пазнавальны серыял "Новыя храмы дзікай прыроды" (Францыя). 1-я серыя.
**09.00** Фантастычны серыял "Філ з будучыні" (ЗША).
**09.45** Таемны густ.
**10.20** Школа рамонту.
**11.15** Невытлумачальна, але факт.
**12.15** "Лабірынты: фантомы і рэаліі "Чорнага замка Альшанскага".
**12.45** Фантастычны фільм "Апошняя сутычка" (ЗША).
**14.25** Меладрама "Дні надзеі" (Украіна).
**16.05** Гістарычны фільм "Анастасія Слуцкая" ("Беларусьфільм").
**17.45** Вострасюжэтны серыял "Зваротны адлік" (Расія). 1-4, заключная, серыі.
**20.55** Камедыйны баявік "Выпадковы шпіён" (Ганконг).
**22.30** Трагікамедыя "Жонка па пошце" (ЗША).
**00.10** Казанова.

**РОССИЯ**

**07.00** Весткі.
**07.15** "За сям'ю пячаткамі".
**07.50** Мультфільмы.
**08.00** "Падарожжы музыкі".
**08.30** "Ранішняя пошта" з Юрыем Мікалаевым і Ларысай Грыбалёвай".
**09.05** Мастацка - публіцыстычны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.15** Пакой смеху.
**12.15** Фільм «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». 1-я серыя.
**13.30** "Формула ўлады". Барак Абама - прэзідэнт ЗША.
**14.00** Весткі.
**14.20** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле "Каменская".
**15.20** Да 100-годдзя з дня нараджэння. Прэм'ера. "Таямніца дыпламата № 1. Андрэй Грамыка". Дакументальны фільм.
**16.15** Фільм "Адкрыццё". 1973 г.
**18.00** "Смехапанарама Яўгенія Петрасяна".
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.20** "Суботні вечар".
**21.10** Фільм "Кактус і Алена". Расія, 2006 г.
**23.05** Фільм Яўгенія Гінзбурга "Ганна".
**01.00** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**07.30** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** "Казкі Бажэнава".
**08.40** Мультфільм.
**09.00** "Агляд".
**09.30** "Без рэцэпту".
**10.00** Сёння.
**10.20** "Галоўная дарога".
**10.55** "Кулінарны паядынак".
**11.55** "Кватэрнае пытанне".
**13.00** Сёння.
**13.20** "Асабліва небяспечны!".
**13.55** Мег Райан, Х'ю Джэкман у рамантычнай камедыі "Кейт і Лео".
**16.00** Сёння.
**16.20** "Рэпарцёр А. Зіненка. Лепшыя фільмы".
**17.10** Дэтэктыўны серыял "Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў".
**19.00** Сёння.
**19.25** Самыя гучныя "Рускія сенсацыі": "Лекі апошняй надзеі". "Рабы крэдыту".
**21.15** "Ты не паверыш!".
**22.10** Вострасюжэтны фільм "Адкажы мне".
**23.50** Трылер "Сталёвая пастка".

**EUROSPORT**

**09.30** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 1 м. Фінал. Рым (Італія).
**10.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Вітэль - Кальмар. Францыя. Этап 13. Агляд.
**11.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Жанчыны. 10 м. 1/2 фіналу. Рым (Італія).
**12.30** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 1 м. Фінал. Рым (Італія).
**13.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Вітэль - Кальмар. Францыя. Этап 13.
**14.15** Аўтаспорт. Міжнародная формула мастэрс. Брэндс Хэтч (Вялікабрытанія). Гонка 1.
**15.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Кальмар - Безансон. Францыя. Этап 14.
**18.30** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду з трампліна. Мужчыны. 3 м. Рым (Італія).
**19.30** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Жанчыны. 10 м. Фінал. Рым (Італія).
**21.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Навіны.
**21.15** Бокс. Міжнародны паядынак. Сярэдняя вагавая катэгорыя. Аўтандзіл Хурцыдзэ (Грузія). Адэса (Украіна).
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Кальмар - Безансон. Францыя. Этап 14. Агляд.
**00.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**02.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Кальмар - Безансон. Францыя. Этап 14.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** Чалавек-эпоха: «Анна, сем гадоў на лініі фронту», дак. фільм, рэж. Маша Новікава, 2008 г., Расія
**20.30** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008», ч. 4: канцэрт гурта «Svet Boogie Band»
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Еўфрасіння Полацкая» (пазнавальная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.35** «Дэтэрмінатар», серыял: 2 серыя
**22.25** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**22.50** Аб'ектыў

## 19 ЛІПЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.30** Серыял "Сэрца акіяна" (Францыя).
**08.25** Альманах вандраванняў.
**08.55, 14.00** "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** Арсенал.
**09.35** Серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** "Усе стыхіі".
**11.25** У свеце матораў.
**12.10** Рамантычная меладрама "Чалавек-амфібія".
**14.05** Хранікальна-дакументальны цыкл "Нябачны фронт" (Беларусь).
**14.30** Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. "Насустрач памяці". Дакументальны фільм (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Nota Bene.
**16.05** Фантастычны серыял "Паверхня" (ЗША).
**17.50** Суперлато.
**18.45** Меладрама "А вы яму хто?" (Расія).
**20.35** "Спортлато 5 з 36". Забаўляльнае шоў.
**21.00** "Панарама тыдня" з Юрыем Пракопавым.
**22.00** «Славянскі базар у Віцебску-2009». "Хор Турэцкага".
**23.30** Рамантычная гісторыя "Крок наперад".

**07.00** АНТ прадстаўляе : "Нядзельная раніца".
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** "Шчаслівыя разам". Камедыйны серыял.
**09.50** "Шалапутныя нататкі" з Дзмітрыем Крыловым.
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** Прэм'ера. Сучаснае беларускае кіно "Навагоднія прыгоды ў ліпені".
**13.05** Прэм'ера. "Скарб нацыі".
**14.05** Фільм "Мая дзяўчынка".
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** "Розыгрыш". Лепшае.
**17.35** "КВЗ". Прэм'ер-ліга.
**19.10** АНТ прадстаўляе : "Рэкламная паўза".
**20.00** Контуры.
**21.05** Марат Башараў, Марыя Галубкіна ў шматсерыйным фільме "Вясковая камедыя".
**22.15** "Вялікая розніца".
**23.15-01.30** Роберт Дэ Ніра, Робін Уільямс у фільме "Абуджэнне".

**06.30** "Турысты". Камедыйны серыял.
**07.20** "Сямейнае кіно": "У пошуках капітана Гранта". СССР, 1985г. 1-я і 2-я серыі.
**09.30** "Добры дзень, доктар!".
**10.00** "Відавочца прадстаўляе: самае смешнае".
**10.55** "Вялікі сняданак".
**11.30** "Аўтапанарама".
**12.00** "Салдаты. Залатыя серыі".
**14.50** "Дарагая перадача".
**15.00** "Культурнае жыццё" з Аляксандрам Ефрэмавым.
**15.30** "Рэтраманія".
**16.30** "24 гадзіны".
**16.50** «Прыватныя гісторыі».
**17.35** "Асабісты інтарэс" з Паўлам Каранеўскім.
**17.55** "Аўтапанарама".
**18.20** "Залатая калекцыя": "Супрацьстаянне". СССР, 1985г. 4-я серыя.
**19.30** "Тыдзень". Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** "Фільм тыдня": "Другая жонка".
**22.35** "Спартовы тыдзень".
**22.55** СТБ прадстаўляе: канцэрт гуртоў "Камуфляж" і "Тэхналогія".
**23.55** "Уцёкі". Серыял.

**08.10** Мір вашаму дому.
**08.20** Мультсерыял "Мышка Марго" (Вялікабрытанія). 3-я і 4-я серыі.
**08.40** Серыял "Філ з будучыні" (ЗША).
**09.50** Прыгодніцкі фільм "Вершнік без галавы".
**11.30** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**12.05** Пасоўванне +.
**12.25** Гаспадар.
**12.50** Лірычная камедыя "Неспадзяваная радасць" (Расія). 1-4, заключная, серыі.
**16.00** Камедыйны серыял "Дурнушка Бэцці-2".
**16.45** Прыгодніцкая камедыя "На рыбалку".
**18.20** Меладрама "Гульні дарослых дзяўчынак" (Украіна).
**20.40** Тэлебарометр.
**21.00** Экспедыцыя.
**21.30** Гістарычны баявік "Братэрства ваўка" (Францыя).
**00.00** "Правы чалавека". Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**00.15** Свая музыка.

**07.00** Вітаўтас Томкус у фільме "Быць лішнім".
**08.40** Фільм "Адкрыццё".
**10.05** "Мой срэбны шар. Георгій Тоўстаногаў". Вядучы - Віталь Вульф.
**11.00** Весткі.
**11.15** "Сам сабе рэжысёр".
**12.10** Фільм «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». 2-я серыя.
**13.25** "Гарадок". Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**14.00** Весткі.
**14.20** Алена Якаўлева ў тэлесерыяле "Каменская".
**15.20** Да юбілею. Прэм'ера. "Мая "жалезная лэдзі". Таццяна Ліёзнава".
**16.15** Фільм Ігара Масленікава "Пікавая дама".
**17.55** "Смяяцца дазваляецца". Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** "Сумленны дэтэктыў". Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**20.40** Фільм "Уварванне", Расія, 2008 г.
**22.40** КВЗ. Першая ліга. 1/4 фіналу.
**00.40** Заканчэнне эфіру.

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** "Дзікі мір" з Цімафеем Бажэнавым.
**08.45** "Іх норавы".
**09.25** " Ядзім дома!".
**10.00** Сёння.
**10.20** "Выратавальнікі".
**10.50** "Авіятары".
**11.20** "Змаганне за ўласнасць".
**11.55** "Дачны адказ".
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. "Незаменны". Да 100-годдзя з дня нараджэння А.А. Грамыка.
**14.10** Рамантычная камедыя "Спытайце Сіндзі".
**16.00** Сёння.
**16.20** "Рэпарцёр А. Зіненка. Лепшыя фільмы".
**17.10** Дэтэктыўны серыял "Закон і парадак. Злачынны намер".
**19.00** Сёння.
**19.25** "Чыстасардэчнае прызнанне".
**20.00** Шматсерыйны фільм "Ганчакі: жаночая доля".
**23.45** "Футбольная ноч".
**00.15** Алёна Свірыдава: "Сірэна, або 12 гісторый, расказаных досвіткам".

**09.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Ле Ман (Францыя). Гонка 1.
**10.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Жанчыны. 10 м. Фінал. Рым (Італія).
**11.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Жанчыны. 1 м. Папярэднія спаборніцтвы. Рым (Італія).
**13.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Брэндс Хэтч (Вялікабрытанія). Гонка 1.
**14.30** Аутаспорт. Формула-2. Брэндс Хэтч (Вялікабрытанія).
**15.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Брэндс Хэтч (Вялікабрытанія). Гонка 2.
**16.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Пантарлье - Вербье. Францыя. Этап 15.
**18.45** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду з трампліна. Жанчыны. 10 м. Рым (Італія).
**19.15** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду з трампліна. Жанчыны. 10 м. Фінал. Рым (Італія).
**20.30** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. Жанчыны. 1 м. Фінал. Рым (Італія).
**21.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Навіны.
**21.45** Мотаспартовы часопіс.
**22.00** Бокс. Міжнародны паядынак. Другая паўсярэдняя вагавая катэгорыя. Л.Абрегу (Аргентына) - Ірвінг Гарсія (Пуэрта-Рыко). ЗША.
**23.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Пантарлье - Вербье. Францыя. Этап 15. Агляд.
**00.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Ле Ман (Францыя). Гонка 2.
**00.30** Мотаспартовы часопіс.
**00.45** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду з трампліна. Жанчыны. 10 м. Фінал. Рым (Італія).
**01.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур дэ Франс. Пантарлье - Вербье. Францыя. Этап 15.

**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 10 серыя
**20.05** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзень Перамогі», дак. фільм, рэж. Ярослаў Каменьскі, 1997 г., Польшча
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла» (пазнавальная праграма)
Ён стаў заснавальнікам дынастыі Ягелонаў, у гісторыю Беларусі ўвайшоў як даволі супярэчлівая постаць. У барацьбе за ўладу не пашкадаваў свайго дзядзькі і ўрэшце быў вымушаны саступіць вялікакняскі сталец пляменніку Вітаўту, прыняўшы польскую карону.
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.45** Фільматэка майстроў:
«Дзікія пчолы», маст. фільм, рэж. Богдан Слама, 2001 г., Чэхія.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________
(по реестру ф. 11)
№ ____________
(по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ
НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.
(сумма прописью)

Кому
Куда
Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________

Адрес ____________
(почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за июль, август, сентябрь 2007 г. (Ненужное зачеркнуть) | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ____
Всего ____
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за июль, август, сентябрь 2007 г. (Ненужное зачеркнуть) | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ____
Всего ____
Кассир

ВЫБАРЫ

# БРАВА, МАРЫНА!

Іван Біч

**Марына Ле Пэн давяла, што годная свайго бацькі — лідэра французскіх правых радыкалаў Жан-Мары Ле Пэна.**

Марына Ле Пэн у палітыцы ледзь не з дзяцінства. Яна нарадзілася ў вельмі палітызаванай сям'і ў 1968 годзе. На гэты час яе бацька Жан-Мары Ле Пэн ужо меў досвед дэпутата і праславіўся на ўсю краіну фразай: "Францыяй кіруюць під...сы: Сартр, Камю і Маро". Калі Марыне было чатыры гады, Жан-Мары заснаваў партыю Нацыянальны Фронт.

Натуральна, дзяўчынка стала цікавіцца палітыкай вельмі рана: з часам уступіла ў бацькоўскую партыю, і нават яе муж — адзін з лідэраў Нацыянальнага Фронту.

Ужо ва ўзросце 18 гадоў яна пачала балатавацца ў дэпутаты. Аднак, трэба прызнаць, вялікіх поспехаў на гэтай глебе не займела. Яе рэкорд на выбарах у рэгіянальны парламент — 22 працэнты. Куды больш яе імя мільгала ў прэсе ў сувязі са шматлікімі скандаламі ўнутры Нацыянальнага Фронту. Жан-Мары хацеў, каб менавіта дачка пасля яго выхаду на пенсію стала ў руля партыі. Аднак шмат хто ў апараце Нацыянальнага Фронту выступаў супраць дынастычнага прынцыпу перадачы старшынства. Праблема нашчадка Жан-Мары некалькі разоў прыводзіла да адколу ад партыі незадаволеных груповак. Марына была вымушана ўвесь час даказваць, чаго яна вартая.

Цяпер Марына сапраўды давяла, што яна не толькі вопытны функцыянер, нядрэнны трыбун, добры імідж-мейкер і майстар партыйных інтрыг. Гэтыя якасці за ёй прызнаюць нават палітычныя ворагі. У дадатак, яна сапраўдны палітык.

Усё пачалося некалькі гадоў таму, калі яна нечакана пачала ўсё часцей наведвацца ў гарадок Энін-Бамон на мяжы з Бельгіяй, дзе жывуць усяго 26 тысяч чалавек. Пра гэты горад звычайныя палітыкі амаль нічога не ведалі. Гэта быў тыповы горад былых гарнякоў, дзе з-за закрыцця нерэнтабельных шахтаў катастрафічна вырасла колькасць беспрацоўных.

Выбар Марыны здаваўся вельмі дзіўным. У гэтым раёне Францыі не шмат эмігрантаў, барацьба з якімі ёсць галоўным лозунгам нацыяналістычнай прапаганды. Акрамя таго, тут моцныя левыя традыцыі. За сацыялістаў дружна галасавалі яшчэ з часоў Парыжскай камуны.

Аднак, трэба прызнаць, што ў дачкі Ле Пэна проста цудоўны палітычны інстынкт. Інакш бы прыкладна год таму назва Энін-Бамон не трапіла на старонкі нацыянальнай прэсы. Падстава: гарадскі мэр, сацыяліст Жэрар Далангвіль трапіў у турму з-за факту карупцыі. Давялося прызначаць новыя выбары гарадскога савету. Першы тур прынёс сенсацыю еўрапейскага маштабу: ліст нацыяналістаў (Марына ў ім была на другім месцы), атрымаў



40 працэнтаў галасоў. На другі тур нацыяналісты ішлі на выбары пад лозунгам барацьбы з карупцыяй, як партыя, якая супрацьстаіць палітычнаму істэблішменту. Тэма карупцыі і недаверу буржуа да старых партый дастаткова новая ў рыторыкі Нацыянальнага Фронту. Як было сказана вышэй, дзесяцігоддзямі партыя эксплуатавала тэму эміграцыі.

Аднак цяпер лаўры галоўнага змагара з навалай чужынцаў прыпісаў сябе Нікаля Сарказі, з падачы якога быў прыняты тузін законаў супраць іншаземцаў. Так ці інакш, Марына




зрабіла правільную стаўку. Колькасць галасуючых за Нацыянальны Фронт вырасла ўдвая.

"Рымейк красавіка 2002 года", — адрэагавала ўся прагрэсіўная прэса Францыі на навіны з Энін-Бамона. Тады Жан-Мары Ле Пэн здолеў прайсці ў другі тур прэзідэнцкіх выбараў. Гэта быў шок!

Перамога правых у Энін-Бамон магла азначаць вяртанне Нацыянальнага Фронту ў сур'ёзную палітыку. Нагадаем, што ў сярэдзіне 1990-х Нацыянальны Фронт кантраляваў чатыры вялікія гарады поўдня. Аднак хутка выбаршчыкі расчараваліся ў палітыцы нацыяналістаў (яны, напрыклад давалі прэмію белым бацькам за народжанае дзіця).

У любым выпадку, левыя абвясцілі стан трывогі. Адзін з лідэраў сацыялістаў лічыць Марыну "небяспечнейшай за яе бацьку" і прагназуе: "Калі Марына стане босам Нацыянальнага Фронту, партыя ператворыцца ў аналаг Саюза фашыстаў Мусаліні". Сама Марына назвала кампанію левых "камедыяй".

Аднак на гэты раз яна памылілася. У выніку выбараў 5 ліпеня кандыдат ад левага Рэспубліканскага Альянсу Даніэль Дуке здолеў атрымаць 54 працэнты. Правыя прайгралі.

Прыйшоў час для аналітыкаў падводзіць вынікі. Самая парадаксальная высνова: правыя ў Энін-Бамон не прайгралі. Ужо тое, што адрыў Дуке ад канкурэнта складае ўсяго 500 галасоў, гаворыць шмат пра што. Нават лева-ліберальная газета "*Le Monde*", якая традыцыйна выступае супраць правых, прызнала, што Марына заслужыла кампліментаў і воклічаў "Брава!". Менавіта такімі крыкамі віталі яе прыхільнікі, калі на прэс-канферэнцыі пасля выбараў яна прызнала сваю паразу.

Не прайгралі і левыя, якія, здавалася б, толькі за кошт мабілізацыі ўсіх рэсурсаў і моцнай агітацыі змаглі вырваць перамогу ў Нацыянальнага Фронту. Наадварот, факт кааперацыі ўсіх левых партый дае іх актывістам надзею на пачатак працэсу аб'яднання і стварэння аднаго полюсу левых сіл. Зараз ідуць кансультацыі.

Як не дзіўна, прайграў цяперашні прэзідэнт Нікаля Сарказі, чыя партыя "Саюз за народны рух" (*UMP*) амаль не ўплывае на палітычную сітуацыю. Ці значыць гэта, што Нацыянальны Фронт у будучым мае шансы стаць галоўнай правай партыяй Францыі? Каб адказаць на гэта пытанне, трэба дачакацца рэгіянальных выбараў у наступным годзе.

Што да Марыны, то яна публічна паабяцала сваім прыхільнікам, што "наступным разам усё будзе лепш". Ёй і так, думаецца, някепска. Цяпер ніхто не зможа аспрэчыць, што лепшага кандыдата на пасаду лідэра Нацыянальнага Фронту няма.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Назіральнікі пагаджаюцца з тым, што ЗША таксама пераходзяць ад палітыкі санкцый да так званай "пакрокавай стратэгіі", аднак лічаць, што ў бліжэйшы час поўнай адмены санкцый чакаць не трэба. ЗША не залежаць ад Беларусі ў плане транзіту, наркатрафіку і нелегальнай эміграцыі. Акрамя таго яны заўсёды займалі больш жорсткую пазіцыю ў пытанні правоў чалавека. ЗША працягнуць выстаўляць Беларусі ўмовы: паступовая адмена санкцый у абмен на дэмакратызацыю.

**"Независимая газета", (Расія)**

Па сутнасці гэта (парад у гонар Дня Незалежнасці) ёсць карыкатура на краіну, якая геаграфічна знаходзіцца ў цэнтры Еўропы і прэзідэнт якой у апошні час усё часцей фліртуе з ЕС. Зразумела, што Еўропа не стала палітычнай мадэллю для Беларусі. Яна патрэбная Мінску выключна як крыніца інвестыцый.

**"Volkskrant" (Нідэрланды)**

Нават нягледзячы на эканамічны крызіс Бацька не захацеў адмаўляцца ад традыцыйнага параду, у якім прынялі ўдзел тры тысячы вайскоўцаў, ракетныя сістэмы С–300, сістэмы «Смерч» і «Град», вялікая колькасць іншай тэхнікі. Беларускі кіраўнік яшчэ раз нагадаў, што беларусы і расіяне — адзін народ, і Беларусь не гандлюе сяброўствам з Расіяй. Адкладзем у бок гістарычныя дыскусіі і адзначым, што ў апошні час Масква кажа, нібыта з Мінску ідуць абсалютна іншыя сігналы. Згадаем непрызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Усё гэта не можа не выклікаць помсты з боку Крамля. Пасля "малочнай вайны" Масква можа абвясціць "газавую" або іншую. Цяперашняе лета абяцае быць вельмі гарачым для Беларусі.

**"Il Legno Storto" (Італія)**

Лукашэнку трэба будзе моцна пастарацца, каб пераканаць замежных інвестараў у доўгатэрміновасці сваіх намераў. Пакуль гэта больш нагадвае ліхаманкавае жаданне знайсці грошы для казны. Мітусня паміж Расіяй, Еўропай і ЗША не прынесла больш-менш значных інвестыцый у эканоміку Беларусі. І амерыканцы, і еўрапейцы гатовыя дапамагаць краіне выключна ў абмен на рэальнае паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека. Бацька да гэтага не гатовы. Інакш у апошні час дэпутаты парламента не падавалі б сігналы наконт таго, што пытанне прызнання Паўднёвай Асеціі і Абхазіі будзе вось-вось вырашана. Здаецца, Аляксандр Лукашэнка замест рэальных крокаў у бок Еўропы зноў хоча ўжыць свой улюбёны метад — шантаж.

**"Московский Комсомолец" (Расія)**

Усё больш беларусаў схіляюцца да ідэі ўступлення ў Еўрасаюз — іх колькасць амаль роўная прыхільнікам Саюза з Расіяй. Па дадзеных апытання, сярод прыхільнікаў Лукашэнкі праеўрапейскія настроі выраслі ўдвая.

**"Эксперт" (Расія)**

Новая трактарна-камбайнавая вайна разгараецца на фоне заяў Лукашэнкі пра тое, што ён можа абраць не Мытны саюз з Расіяй і Казахстанам, а зону вольнага гандлю з ЕС. "Беларусь будуе свае прыярытэты, робячы арыентацыю на часовы фактар, заявіў ён у інтэрв'ю аўстрыйскай газеце "Die Presse". Для нас прыярытэт у тым, што мы зможам раней рэалізаваць", — сказаў ён. У тым, як лавіруе Лукашэнка паміж Расіяй і Захадам, больш палітыкі, чым эканомікі. Беларускія камбайны канкурэнтныя за кошт нізкай цаны. Яны танныя ў эксплуатацыі, аднак на заходнім рынку нікому не патрэбныя. Тым больш, што там моцнае аграрнае лобі.

**"Газета" (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### САУДАЎСКАЯ АРАВІЯ. ХОЧАЦЕ АТАКАВАЦЬ ІРАН? МЫ РАЗАМ

Кіраўніцтва Саудаўскай Аравіі дало тайную згоду ўраду Ізраіля на выкарыстанне паветранай прасторы краіны для нанясення ракетнага ўдару па Ірану. Такую інфармацыю са спасылкай на свае крыніцы ў дыпламатычных ведамствах апублікавала брытанская "Sunday Times". Тэль-Авіў даўно заяўляў, што ў выпадку рэалізацыі планаў Тэгерану па стварэнню атамнай бомбы можа нанесці прэвентыўны ўдар па базах іранцаў. Але каб дасягнуць тэрыторыі Ірану, ракеты павінны праляцець над Саудаўскай Аравіі і могуць быць збітыя. Таму рашэнне арабскага ўраду можна лічыць вялікай перамогай ізраільскай дыпламатыі. Дастаткова сказаць, што краіны Саудаўская Аравія і Ізраіль не прызнаюць адна адну.

**Па матэрыялах "Le Monde" (Францыя)**

### АЗЕРБАЙДЖАН. МЯСЦОВАЯ "БЕЛАЯ РУСЬ" ІДЗЕ Ў ЕЎРОПУ

Еўрапейская народная партыя (ЕНП), якая аб'ядноўвае партыі кансерватыўнага і хрысціянска-дэмакратычнага накірунку, нечакана заявіла пра намер супрацоўнічаць з партыяй "Ені Азербайджан". "Ені Азербайджан" — гэта азербайджанскі аналаг беларускай арганізацыі "Белая Русь". Партыя створана па загаду папярэдняга прэзідэнта Гейдара Аліева і, натуральна, карыстаецца падтрымкай вертыкалі і афіцыйных СМІ. У "Ені Азербайджан" прымусова запісваюць цэлымі працоўнымі калектывамі (цяпер у партыі 360 тысяч сяброў). На выбарах партыя атрымлівае пераважную большасць галасоў. У Законе аб партыях чорным па белым запісана, што кіраўнік дзяржавы не можа быць старшынёй партыі. Аднак і Гейдару Аліеву, і цяперашняму старшыні партыі Ільхаму Аліеву, які адначасова з'яўляецца прэзідэнтам, закон не пісаны. Дзіўна, што еўрапейскія кансерватары збіраюцца супрацоўнічаць з "Ені Азербайджан". Хаця, магчыма, гэта тактычны ход, мэта якога — паступовая лібералізацыя ў Азербайджане. Канкрэтная мадэль каапераці паміж ЕНП і "Ені Азербайджан" будзе распрацаваная ўвосень.

**Па матэрыялах "Трэнд" (Азербайджан)**

### КАЛУМБІЯ. ІГНРЫД БЕТАНКУР ЗДЫМАЕ ФІЛЬМ

Прайшоў роўна год з таго часу, як Інгрыд Бетанкур, экс-кандыдат у прэзідэнты Калумбіі ад партыі Зялёных, была вызваленая з палону, дзе яе ўтрымлівалі ультралевыя партызаны з групоўкі "Народныя сілы Калумбіі" (FARC). За апошні год Інгрыд шмат паспела: развялася з мужам, які зрабіў вельмі шмат для яе вызвалення, стала кумірам французаў (яна мае таксама французскі пашпарт), пачала пісаць кнігу пра свае прыгоды ў палоне (прэзентацыя адбудзецца ў верасні). Цяпер Інгрыд вырашыла падацца ў кінематограф. Прадзюсер славутага "Спісу Шындлера" вырашыў фінансаваць стужку, сцэнар якой будзе напісаны на базе тых самых мемуараў Бетанкур. Думаецца, што фільм атрымаецца вельмі ўражваючым. Інгрыд прасядзела ў партызанскай турме шэсць гадоў, і ёй вельмі дасталася — акрамя таго, што на жанчыну быў аказаны моцны псіхалагічны ціск, яе трымалі на ланцугу і гвалцілі.

**Па матэрыялах "El Pais" (Іспанія)**

### ГЕРМАНІЯ. ПЕРШЫЯ САЛДАТЫ АТРЫМАЛІ ЖАЛЕЗНЫЯ КРЫЖЫ

Радыкальныя пратэсты сярод нямецкіх левых выклікала цырымонія ўзнагароджання Жалезнымі крыжамі салдат, якія ўдзельнічалі ў аперацыях NATO. Для левых Жалезны крыж — адзін з сімвалаў Трэцяга рэйху. Падчас другой сусветнай вайны яго насіла так шмат салдат (2,3 мільёны), што ў акупаваных народаў узнікла асацыяцыя паміж фашысцкім рэжымам і ўзнагародай. Нядзіўна, што ў 1945 годзе Жалезны крыж забаранілі. Цяпер, пасля 64 гадоў забароны, Жалезны крыж зноў пачне ўпрыгожваць мундзіры нямецкіх салдат. Яго будуць даваць выключна тым, хто дзейнічае ў рамках гуманітарных вайсковых аперацый за мяжой. Сярод першых уладальнікаў Жалезнага крыжа нямецкія салдаты, якія выратавалі шмат дзяцей пасля аднаго з тэрактаў у Афганістане.

**Па матэрыялах "Frankfurt Rundchau" (Германія)**

### ІНДЫЯ. МІЛЬЯНЕР З ТРУШЧОБАЎ НАБЫЎ НЕРУХОМАСЦЬ

11-гадовы Ажарудзін Махамед Ісмаіл праславіўся на ўвесь свет дзякуючы выкананню галоўнай ролі ў фільме "Мільянер з трушчобаў". На ганарар ад здымкаў ён змог набыць цэлы дом, куды пераехаў разам з маці. Раней яны жылі ў металічнай халупе. Калі малы пабачыў новы дом, ён нават пачаў танчыць і хваліць рэжысёра Дэні Бойла, які абраў яго на ролю. Менавіта Дэні і набыў малому дом. Кіношнік пералічыў на рахунак хлопчыка 50 тысяч долараў ЗША. Больш за ўсё ў новым доме малога уразіў унітаз.

**Па матэрыялах "Guardian" (Вялікабрытанія)**

▶ **КАМЕНТАР**

# ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ ДЭПУТАТА ЛАЗІНСКАГА

**Украінскае палітычнае жыццё звычайна багатае на скандалы, аднак такі маштабны цяжка згадаць. Дэпутата ад Блоку Юліі Цімашэнка (БЮТ) падазраюць у тым, што ў якасці забавы ён арганізоўваў паляванне на людзей. Пра падрабязнасці справы журналіст "НЧ" Алег Новікаў размаўляе з украінскім палітолагам, рэдактарам сайта Politicum Уладзімірам Задзіракам.**






— *Нагадай, калі ласка, хранялогію падзей.*

— 16 чэрвеня ў Кіравагградскай вобласці ў вёсцы Грузьке пры загадкавых абставінах пайшоў з жыцця 55-гадовы Валерый Алейнік. Яго даставілі ў бальніцу з прастрэленай нагой, якую давялося ампутаваць. На аперацыйным стале пацыент памёр. На наступны дзень нацыяналістычная партыя "Свабода" Алега Цягнібока ўсклала віну за забойства на Віктара Лазінскага (дэпутата БЮТ), Яўгена Горбенку (раённага пракурора) і Міхаіла Кавальскага (кіраўніка мясцовай міліцыі). Літаральна адразу кіравагградскі МУС прапанаваў сваю версію: быццам згаданая тройка спрабавала арыштаваць узброенага злачынцу Алейніка, які быццам напаў на іх. Таксама ёсць інфармацыя пра тое, што быццам Алейнік рыхтаваў замах на дэпутата. Менавіта падчас замаху ён і быў моцна паранены. Партыя БЮТ увогуле прапанавала выдаць Лазінскаму і кампаніі ўзнагароды за дапамогу міліцыі.

— *Як узнікла версія пра тое, што сапраўдны забойца — Віктар Лазінскі?*

— Бомба выбухнула прыблізна 23 чэрвеня, калі незалежныя журналісты з Кіева (мясцовая прэса была даўно куплена Лазінскім), наведалі месца падзей і даведаліся пра некаторыя пікантныя абставіны сітуацыі ў Грузьке. Па словах сялян, Лазінскі незаконна прыбраў да рук мясцовыя лясныя прадпрыемствы, іх зямельныя паі. Ён сябруе з міліцыяй і пракуратурай, таму яму ўсё сыходзіць з рук. Больш таго, часам ён арганізуе ў сваіх лясах паляванні, аб'ектамі якіх ёсць не жывёлы, а... жывыя людзі. Прынцып гульні просты: чалавек бяжыць, а Лазінскі з сябрамі пераследуюць яго са стрэльбамі на машынах. Тутэйшыя кажуць, што падобныя забавы практыкаваліся як мінімум разоў 15. Хутчэй за ўсё, ахвярай падобнай аблавы стаў і Валеры Алейнік. Ён ішоў па лесу, калі сустрэў джып Лазінскага. Кінуўся бегчы, аднак машына дагнала яго. Нехта з пасажыраў прастрэліў яму нагу. Алейнік паспрабаваў схавацца ў лесапасадцы, аднак яго знайшлі і моцна паранілі. На карысць гэтай версіі кажуць вынікі экспертызы: сам Алейнік не страляў.

— *Гісторыя папросту сюррэалістычная. На пачатку XXI стагоддзя на людзей арганізоўваюць паляванне. Што гэта — феномен маральнай дэградацыі кіравагградскай эліты або нейкія сацыяльныя трэнды ў вёсцы?*

— Мяркую, што гэта не проста выпадак. Традыцыйна адносіны ўлады і людзей на вёсцы вельмі дрэнныя, асабліва калі мова ідзе пра права сялян карыстацца ляснымі і воднымі рэсурсамі. Ёсць такое вядомае апавяданне "Бур'ян", пра тое, як чырвонаармейцы ў 1920-я гады вяртаюцца з фронту ў родную вёску і задаюцца пытаннем: за што мы змагаліся? Старшыня сельсавету фактычна падмяніў сабой латыфундыста. Адсюль і вялікая любоў у народзе да розных атаманаў кшталту Махно або Кармалюка, якія абаранялі селяніна ад ціску паноў.

— *Ці верыш ты, што падобныя адстрэлы людзей праводзіліся рэгулярна? Генпракурор Украіны Аляксандр Мядзведзька кажа, што ў мясцовых архівах МУЗ згадваюцца толькі два выпадкі, калі ў гэтых краях за апошні час знікалі людзі.*

— Думаю, што паляванні адбываліся больш-менш рэгулярна. Толькі забівалі яны не мясцовых, а бамжоў, якія ў прынцыпе нікому не патрэбныя. У тым і справа, што на гэты раз быў забіты мясцовы, родзічы якога пачалі шукаць праўду. І калі справа пайшла ў прэсу, акцэнты змяніліся. 24 чэрвеня Вярхоўная Рада хвілінай маўчання ўшанавала памяць Алейніка. 1 ліпеня пракуратура распачала крымінальную справу супраць Лазінскага. БЮТ, каб неяк адмыцца, ініцыяваў галасаванне за пазбаўленне Лазінскага дэпутацкай недатыкальнасці. Праўда, яшчэ напярэдадні сам Лазінскі пайшоў у падполле. Пытанне, зловяць ці не Лазінскага, вельмі горача дыскутуецца ва ўкраінскіх СМІ. У Лазінскага вельмі моцныя сувязі ў вышэйшых эшалонах улады.

— *Як можа скандал адбіцца на палітычным працэсе? Вось-вось стартуе выбарчая прэзідэнцкая кампанія.*

— Безумоўна, перш за ўсё справа Лазінскага ўдарыла па пазіцыях БЮТ. Па сутнасці, партыя засведчыла, што спіс БЮТ фармуецца не на падмурку ідэйных прынцыпаў, як сцвярджае Юля, а па прынцыпу, хто больш дасць грошай. Цяпер трэба чакаць рашучых акцый з боку Цімашэнка, якой трэба ратаваць рэйтынг. Бонусы на справе Лазінскага атрымалі Партыя рэгіёнаў і Юшчанка. Апошні аператыўна зняў з пасады кіравагградскага губернатара.

— *Якія прагноз развіцця падзей?*

— У верасні спецыяльна створаная пра Радзе камісія па кіравагградскай справе прадставіць вынікі свайго расследавання. Тут яшчэ шмат што не ясна. Напрыклад, чаму забойцы замест таго, каб схаваць труп Алейніка, выклікалі "хуткую". Ёсць версія, што з імі быў яшчэ нехта, хто, на іх думку, быў ненадзейным. Магчыма, гэта была жанчына. Потым, калі Лазінскага знойдуць, будзе суд. Напрыканцы адзначу: нягледзячы на ўвесь трагізм гэтай гісторыі, адзін пазітыў тут ёсць. Незалежныя СМІ змаглі ўскрыць кіравагградскі нарыў. Баюся, што, калі б зараз былі часы Кучмы, Лазінскі сапраўды мог быць прадстаўлены да ўзнагароды за дапамогу ў ліквідацыі небяспечнага злачынцы.

СУСТРЭЧА

# МЯДЗВЕДЗЕЎ — АБАМА: ДЭКЛАРАЦЫІ І СПАДЗЯВАННІ

Алег Пятроў

**Нягледзячы на тое, што падчас сустрэчы Барака Абамы і Дзмітрыя Мядзведзева размова галоўным чынам ішла пра стратэгічныя і глабальныя пытанні, вынікі візіту будуць мець важнае значэнне для раскладу сіл у Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**



Нагадаем, што па выніках сустрэчы прэзідэнты падпісалі шэраг дакументаў: пагадненне пра далейшыя скарачэнні і абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў, дамову паміж урадамі пра транзіт ваеннай тэхнікі і персаналу NATO праз тэрыторыю РФ у Афганістан. Таксама быў падпісаны дакумент пра супрацоўніцтва паміж узброенымі сіламі Расіі і ЗША, і прынятае рашэнне пра стварэнне сумеснай прэзідэнцкай камісіі па развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Праблемы ў зоне СНД не значыліся ў павестцы дня сустрэчы. І, як пішуць шматлікія замежныя выданні, гэта ўжо само па сабе не выпадкова. Можна казаць пра тое, што ЗША мяняюць сваю тактыку ў рэгіёне, перш за ўсё ў пытанні ўступлення Украіны і Грузіі ў NATO.

Некаторыя нямецкія СМІ, аналізуючы вынікі візіту, прыходзяць да высновы, што ўступленне Украіны і Грузіі ў NATO страціла для ЗША актуальнасць.

Берлінская газета "*Die Welt*" піша, што "задэклараванае Абамам імкненне да ядзернага раззбраення ці бяз'ядзернаму свету важнае яму не само па сабе, а як сродак дасягнення мэты. Амерыканскаму прэзідэнту патрэбны давер Расіі, каб нацiснуць на іранскі рэжым, вырашыць праблемы лагістыкі ў забеспячэнні міжнароднага кантынгенту сіл у Афганістане і націснуць на рэжым Паўночнай Карэі. Дзеля гэтага Абама гатовы пайсці на саступкі: не прызнаючы фармальнага права вета Масквы на пашырэнне NATO, уступленне туды Грузіі ці Украіны пераносіцца".

Мюнхенская газета "*Suddeutsche Zeitung*" піша: "Абаме неабходны хуткі поспех на міжнароднай арэне, а Расіі — вяртанне сабе ролі глабальнай дзяржавы... Расія чакае ад ЗША стрыманасці ў зоне свайго непасрэднага суседства (асабліва ва Украіне). Абама газэты заплюшчыць вочы на гэтыя постімперскія амбіцыі".

Газета "*Stuttgarter Zeitung*" дадае: "Абама павінен зразумець, што ёсць тэмы, якія настолькі важныя для нацыянальных інтарэсаў Расіі, што пазіцыя Масквы па іх будзе непахіснай. Гэта тычыцца намераў Украіны стаць сябрам NATO". Праўда, газета прызнае, што новы старт цалкам магчымы, але не раней, чым будзе вырашана пытанне Афганістана і Ірана.

Ва Украіне вынікі візіту сапраўды ацанілі як канчатковы крах праекту сяброўства ў Паўночнаатлантычным Альянсе.

Блізкая да Партыі рэгіёнаў газета "*Сегодня*" піша: "Абама з Мядзведзевым сустракаўся за сняданкам "у рускім стылі" — з самаварам і аладкамі. У такім душэўным становішчы Мядзведзеў тэхнічна вывеў Абаму на тэму расійска-украінскіх адносін. У выніку, калі верыць намесніку кіраўніка апарата ўрада РФ Юрыю Ушакову, Абама паабяцаў улічваць пазіцыю Масквы ў адносінах ЗША і Украіны. Па словах Ушакова, такое абяцанне было атрымана пасля таго, як амерыканскі лідэр даведаўся, што ў нашай краіне (ва Украіне) пражываюць не меней за 17 мільёнаў рускіх (мабыць, ён меў на ўвазе рускамоўных, хоць апошніх, напэўна, нават больш)".

Шмат салідных выданняў лічаць, што халодная вайна ЗША і РФ за ўплыў на былыя савецкія рэспублікі будзе працягвацца.

"Вынікам візіту сталі дамовы, большасць якіх не мае юрыдычнай сілы, — гэта толькі дэкларацыі пра намеры. Заходняя прэса піша пра візіт Абамы ў аптымістычным тоне, але адзначае адсутнасць рэальных дасягненняў", — піша украінская "*Газета по-киевски*".

Такой жа думкі прытрымліваецца брытанская "*The Independent*": "Пакуль незразумела, наколькі вялікі эфект будзе мець атмасфера зычлівасці і мяккая рыторыка ўдзельнікаў сустрэчы".

Лічыць, што рана святкаваць і нямецкі "*Handelsblat*": "У Масквы і Вашынгтона застаюцца рознагалоссі па шэрагу пытанняў. У Расіі да Амерыкі ставяцца з вялікай насцярогай (калі пасля распаду СССР пазітыўна да ЗША ставіліся 80% расіянаў, то сёння Злучаным Штатам давяраюць толькі 36%). Як сцвярджаюць журналісты, расійскія СМІ напярэдадні візіту амерыканскага прэзідэнта нават атрымалі распараджэнне "зверху" — паменшыць колькасць антыамерыканскіх публікацый падчас візіту Абамы".

Гэту пазіцыю падзяляе і "*The Washington Post*". Аднак выданне спасылаецца не на аналітыку, а на тое, як у Маскве публіка паставілася да жонкі амерыканскага прэзідэнта. На думку аўтара артыкулу, "у цэлым Мішэль Абама ў Расіі прынялі халадна ў параўнанні з шуміхай, паднятай вакол яе ў Лондане і ў Францыі". А гэта, на думку аўтара, значыць, што звычайныя расіяне не даруюць сваім лідэрам шчыльнай кааперацыі з Амерыкай.

Іранічна адрэагаваў на сустрэчу рыжскі "*Mix News*": "Увогуле, нам ад гэтага Абамы і яго візіту ў Маскву ніякай карысці. Рукі там цісне крывавым чэкістам і акупантам, а не нам тут. Таму і стаўленне да яго візіту ў цэлым скептычнае. Не атрымаецца, маўляў, дамовіцца з імперскай Расіяй з яе савецкімі агрэсіўнымі забабонамі. Не з тымі ён гаворыць, і наогул, як можна высокаму Абаму весці перамовы з чалавекам такога маленькага росту, як Мядзведзеў? Гэта ж смешна выглядае. Абама, задумайся!"

А народ ужо паспеў прыдумаць на тэму візіту Абамы анекдот: "Пуцін з Мядзведзевым частавалі Абаму ў рускім стылі: на стале стаяў самавар, а ў самавары па спрадвечнай рускай традыцыі была гарэлка... Як здзівіўся потым амерыканскі прэзідэнт, калі яму паказалі тое, што ён падпісаў у Маскве"...

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ВАЛЕРЫЙ ІВАШЧАНКА



Часова выконваючы абавязкі міністра абароны Украіны, здаецца, пераплюнуў нават Івана Вакарчука — міністра культуры Украіны, які праславіўся сваёй палітыкай фарсіраванай украінізацыі і стварэння новай дзяржаўнай міфалогіі. Часопіс Мінабароны «Войска Украіны» выйшаў з сенсацыйным артыкулам пра тое, што паўстанне на браняносцы "Пацёмкін" арганізавалі ўкраінскія нацыяналісты. Дасюль лічылася, што славуты бунт упісаны ў канву расійскай рэвалюцыі, тон у якой задавалі сацыялісты. На захопленым матросамі караблі быў узняты чырвоны сцяг, частка пацёмкінцаў пазней стала сябрамі партый эсэраў або сацыял-дэмакратаў. Аднак, аказваецца, не ўсё так проста. Вось што піша галоўны часопіс ведамства Івашчанкі: "Борт "Пацёмкіна", які ўпрыгожваў малінавы сцяг казачай рэспублікі, вольнай ад рускага царызму, можна смела назваць караблём украінскай рэвалюцыі 1917–1918 гг." Аўтар прыводзіць наступныя доказы: большасць матросаў на Чарнаморскім флоце былі ўкраінцамі, два лідэры бунта — Панас Мацюшэнка і Рыгор Вакаленчук былі этнічнымі ўкраінцамі. Калі верыць "Войску Украіны", Панас нават граў на бандуры песні на вершы Шаўчэнка, які быў самым любімым паэтам пацёмкінцаў. Фінал артыкулу: "Паўстанне мела відавочны нацыянальна-вызвольны характар і стала праявай украінскага казачага менталітэту".

### РОБЕРТ МАКНАМАРА



Былы міністр абароны ЗША, дырэктар Сусветнага банку, якому было 93 гады, пайшоў з жыцця. Пачынаў Роберт як кіраўнік аддзелу па продажы абутку ў адным з супермаркетаў Сан-Францыска. З часам зрабіў фантастычную кар'еру ў бізнесе. Яго нават прызначалі кіраўніком канцэрну "Форд" (раней гэту пасаду займалі выключна асобы з сям'і Фордаў). Вядомы, аднак, Роберт больш за ўсё сваімі правaламі на Кубе і ў В'етнаме. Макнамара трапіў у Белы дом па запрашэнню Джона Кенэдзі ў 1961 годзе і навязаў яму суперідэю — бязлітасна разбамбіць Паўночны В'етнам. Такая стратэгія прывяла да пашырэння зоны вайсковых дзеянняў і эскалацыі канфлікту. На Роберце таксама ляжыць адказнасць за беспаспяховы дэсант праціўнікаў Кастра ў Заліве Свіней. Аднак самае цікавае, што ў 1967 годзе Макнамара нечакана адмовіўся ад сваіх папярэдніх планаў і заклікаў прэзідэнта Ліндана Джонсана пакласці канец бамбардзіроўкам. Ліндан за гэта адправіў Роберта ў адстаўку. Макнамара пайшоў працаваць у Сусветны банк і зарэкамендаваў сябе як вялікі сябра краін Трэцяга свету. У 1995-м ён выдаў кнігу ўспамінаў, назваўшы свой курс у В'етнаме "татальная дурасць". Апошні раз Макнамара з'явіўся на публіцы ў пачатку 2000-х, калі крытыкаваў планы Буша-малодшага пачаць вайну ў Іраку.

### АЛЬФРЭДА ПЕРЭС РУБАЛЬКАБА



Міністр унутраных спраў ад Іспанскай сацыялістычнай рабочай партыі (PSOE) паабяцаў перад камерамі журналістам пакласці да 2016 года канец дзейнасці арганізацыі ЕТА. ЕТА, нагадаем, аб'ёднуе радыкальных прыхільнікаў незалежнасці Краіны Баскаў, якія дабіваюцца яе тэрарыстычнымі метадамі. Усім зразумела, што наяўнасць ЕТА пагражае правядзенню Алімпіяды 2016 года ў Мадрыдзе. Трэба прызнаць, што дырэктар МУС порстка ўзяўся за справу. Толькі на мінулым тыдні былі арыштаваны тры баевіка ЕТА. Аднак арыштамі справа не абмежавалася. Рубалькаба загадаў ачысціць сцены дамоў ад плакатаў з выявай палітычных вязняў, сяброў ЕТА. Такія плакаты — звычайная частка урбаністычнага пейзажу Краіны Баскаў. Нацыяналісты іх вешаюць у знак салідарнасці з сябрамі ЕТА ў турмах, дзе тых, дарэчы, аж 740 чалавек. На думку ўладаў, падобная прадукцыя — выключна "праслаўленне тэрарызму". Цяпер Ertzaintza — рэгіянальная баскская паліцыя — толькі тым і займаецца, што змагаецца з плакатамі. Рэакцыя нацыяналістаў была адэкватнай. Цяпер яны носяць выявы вязняў на майках. Які фінал будзе мець вайна з плакатамі, пакуль цяжка сказаць. Шмат залежыць ад суда над хлопцам якраз за тое, што ён насіў майку з выявай аднаго з вязняў.

ПОСТАЦІ

# КАЛІ СТАТЫСТЫКА І ТРАГЕДЫЯ ІДУЦЬ ПОБАЧ

**Там, дзе перагукаюцца званамі Свята-Духаў кафедральны сабор і касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі, павольна адбівае гадзіны гарадская ратуша, жыве пісьменнік і даследчык Леанід Маракоў. Эла Оліна завітала да яго ў госці, каб паразмаўляць пра лёсы людзей, якія адданасцю сваёй справе заслужылі месца ў гісторыі Беларусі і якіх краіна заўчасна страціла.**



Леанід Уладзіміравіч Маракоў — гісторык, энцыклапедыст, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беларускага саюза журналістаў, правамоцны сябра міжнароднага ПЭН-цэнтру — ужо больш за дванаццаць гадоў даследуе рэпрэсіі савецкіх уладаў супраць беларускага, польскага, габрэйскага народаў. Чалавека, які зрабіў няпросты маральны выбар, ахвяраваў уласным бізнесам і маёмасцю, каб захаваць для нашчадкаў імёны загінулых суайчыннікаў, відаць, нешта ўсё ж яднае з Небам.

Старонкі спісу — доўгімі ланцужкамі цягнуцца прозвішчы і разнастайныя звесткі. Насупраць кожнай асобы коратка пазначана, дзе нарадзіўся, жыў, працаваў, па якой справе арыштаваны. “Антысавецкая агітацыя”, “удзел у дзейнасці контррэвалюцыйнай арганізацыі”, “шкодніцкая дзейнасць у гаспадарцы” — тыповыя прысуды тых часоў. Даследчык сабраў вялікую факталагічную базу, сумленна занатаваў старонкі жыцця рэпрэсаваных літаратараў, дзеячаў культуры, асветы, навукоўцаў, святароў і медыкаў, на якіх пасягнула рука НКУС. Цяпер яму пішуць і тэлефануюць з Гомеля, Гродна, Магілёва, Брэста ды іншых гарадоў і мястэчак нашчадкі рэпрэсаваных, каб адшукаць звесткі пра сваіх пацярпелых продкаў. На сайт пісьменніка *www.marakou.by* заходзяць наведвальнікі з Кіева, Лондана, Нью-Йорка, Амстэрдама, Варшавы, Берліна, пакідаюць удзячныя водгукі, зміцняюць партрэты родных. Леанід Маракоў расказвае, што, каб сабраць столькі звестак, даводзіцца многа часу корпацца ў архівах, праз яго рукі праходзяць тысячы аркушаў паперы, на якіх занатаваныя лёсы людзей. Без выходных і адпачынкаў, 12–14 гадзін на суткі — так выглядае працоўны графік даследчыка.

Збіраць звесткі пра ахвяраў сталінскага рэжыму Леанід Маракоў пачаў у 1997 годзе. Тады яму патэлефананавалі з выдавецтва і запыталіся, ці мае рукапісы свайго дзядзькі паэта Леаніда Маракова, які быў любімым вучнем Янкі Купалы. Леанід Маракоў быў расстраляны карнымі органамі НКУС акурат у крывавую ноч з 28 на 29 кастрычніка 1937 года, калі ў Мінскай унутранай турме НКУС было знішчана каля ста прадстаўнікоў беларускай культуры і літаратуры, эліты беларускай нацыі.

У гэтым годзе ў выдавецтве “Смэлтак” выйшаў новы том даследаванняў Леаніда Маракова “Рэпрэсаваныя каталіцкія, духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі 1917–1964 гг.”. У ім сабрана каля 700 біяграфій ксяндзоў і служыцеляў, расказваецца пра дзейнасць 800 касцёлаў, 400 з іх існавалі ў нашай краіне і пазней былі зачыненыя ці разбураныя.

— Кніга пачынаецца з біяграфіі Фабіяна Абрантовіча, — расказвае сп. Леанід. — Пасля заканчэння Магілёўскай семінарыі і духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу ён вучыўся ў каталіцкім універсітэце Лювэна і абараніў доктарскую дысертацыю. У жніўні 1918 года Фабіян Абрантовіч з біскупам Зыгмунтам Лазінскім у Мінску адправіў першую ў XX стагоддзі імшу на беларускай мове. Святар быў рэктарам Духоўнай семінарыі і выступаў за ўвядзенне беларускай мовы ў набажэнства ў Касцёле і духоўных установах, пра гэта неаднаразова пісаў у рэлігійных выданнях. Ён сябраваў з Браніславам Эпімах-Шыпілам, з Янкам Купалам. Зімой 1920 года Фабіян Абрантовіч дзяжурыў каля ложка хворага паэта і падтрымліваў яго духоўна. Пра многіх святароў, чые біяграфіі змешчаныя ў новай кнізе, раней не было звестак у Беларусі. Пачынаючы працу некалькі гадоў таму, я думаў, што змагу яе завяршыць гадоў праз дзесяць. Дзякуючы падтрымцы Касцёла, а менавіта біскупа Антонія Дзямьянкі, удалося сабраць звесткі з-за мяжы, часопісы і кнігі па тэме, паскорыць пошукі.

Леанід Маракоў склаў двухтомны зборнік з біяграфіямі праваслаўных святароў. У пошуках матэрыялу для выдання даследчык наведваў Далёкі Усход, Краснадар, Алтайскі край. У кнізе змешчаны факты з памятных кніг губерняў, мемарыяльных сайтаў і сінодыкаў, дакументы, успаміны сведак. У зборніку, напрыклад, можна знайсці звесткі пра іерэя Міхаіла Сулкоўскага, сваяка блажэннай Валянціны Мінскай.

— Том “Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі. 1917–1967” рабіўся больш за два гады, — каментуе Леанід Маракоў. — З праваслаўных святароў практычна сто адсоткаў былі сасланыя на катаргу, расстраляныя. Можна лічыць, што гэта даведнік не проста рэпрэсаваных, а ўсіх святароў, якія неслі служэнне на Беларусі на пачатку XX стагоддзя.

Зараз я збіраю звесткі пра рэпрэсаваных медыкаў, падрыхтавана ўжо паўтары тысячы біяграфій. Падчас “крывавага тунеля смерці” — піку сталінскіх рэпрэсій (чэрвень 1936 — лістапад 1938 гадоў) з маўклівай згоды Масквы адбылося поўнае запусценне сістэмы медыцынскага абслугоўвання насельніцтва БССР. Тыповым было знішчэнне хворых праз неаказанне ім дапамогі — канцлагеры пад здаровых не паспявалі будаваць, а тут хворыя. Дайшло да таго, што на большасць раённых бальніц БССР прыходзіўся адзін лекар. Адзін на тысячы і тысячы людзей! А ў некаторых бальніцах і ўвогуле — ніводнага. І кожны трэці-чацвёрты ўрачэбны ўчастак быў без доктара. Як вам такое — урачэбны ўчастак і без доктара? Ды што без доктара — без фельчара і акушэркі. У БССР не хапала соцень дактароў і фельчараў, паўтысячы акушэрак, а іх з асаблівай стараннасцю арыштоўвалі і вынішчалі. І арыштоўвалі з такой хуткасцю і перыядычнасцю, што тры сотні выпускнікоў Мінскага і Віцебскага медыцынскіх інстытутаў штогод не паспявалі закрываць гэтыя правалы. Праўда, медыкаў не дзеля руціннай працы розуму вучылі. Спецбальніцы, спецклінікі, спецсанаторыі, спецдамы адпачынку для партыйных бонзаў і супрацоўнікаў НКУС патрабавалі спецабслугоўвання. Для іх і рыхтавалі маладую медыцынскую гвардыю.




Справядлівая сацыялістычная дзяржава хоць і выдзяляла на ахову здароўя будаўніка камунізму ў месяц “цэлыя” 4 рублі (сапраўды, амаль бясплатная медыцына), але, відаць, “цэлых” не хапала. За 1937 год у Барысаве, Віцебску, Гомелі, Лепелі, Магілёве, Мінску, Оршы, Полацку, Рэчыцы дзіцячая смяротнасць узнялася на 30–60 працэнтаў. У Мінскай дзіцячай клініцы ў пакоі дзяжурных маці, размешчаных на дзесяць-дванаццаць чалавек, знаходзілася сорак.

Хворыя не маглі працаваць, не маглі прынесці сістэме дывідэнды, а значыць, падлягалі спісанню-вынішчэнню. Пад вынішчэнне траплялі і асабліва актыўныя выратавальнікі хворых. І не мела значэння, санітарка гэта была, медсястра, галоўны ўрач шпіталя ці загадчык кафедры лячэбнага факультэта. У пятым томе акурат і змешчаныя біяграфіі або кароткія звесткі тых выратавальнікаў. Гэта рэпрэсаваныя ўрачы шпіталяў, бальніц, дыспансераў, радзільных дамоў, паліклінік, медыцынскіх пунктаў і кансультацый, вайсковых частак, месцаў зняволення, супрацоўнікі Народнага камісарыята па ахове здароўя абласных, гарадскіх, раённых медыцынскіх, санітарных, ветэрынарных інспекцый і ўстаноў.

Іх вінавацілі ў інтэлігентнасці, інтэлектуальнасці, адукаванасці, у тым, што яны належалі да людзей думаючых, а значыць, ставіліся да падзей крытычна. Вось гэтых крытыкаў Сталін і вынішчаў. І, як ведаеце, не толькі медыкаў, але настаўнікаў, літаратараў, дзеячаў культуры.

***— Вы — аўтар шэрагу кніг прозы, заўважных грамадскасцю. Як адбыўся пераход ад навуковага даследавання да пісьменства?***

— Пасля напісання тысячы незвычайных, з нечаканымі, трагічнымі паваротамі біяграфій мне захацелася расказаць пра гэтых людзей падрабязна. Таму амаль усе мае апавяданні дакументальныя, гістарычныя. Але ў наш камп'ютарны век я намагаўся напісаць іх так, каб яны чыталіся імгненна, на адным дыханні. Мае героі, сапраўды, непамяркоўныя, бо яны любым коштам, нават коштам жыцця, імкнуцца вырвацца з няволі.

***— Ці падтрымлівае вас сям'я?***

— Я вельмі ўдзячны сваёй сям'і. Жонка Наталля дапамагае мне складаць імянныя і геаграфічныя паказальнікі. Сын Дзмітрый — набірае тэксты. Пятнаццацігадовая дачка Дыяна — не па гадах сур'ёзны чалавек, займаецца ў сярэдняй і мастацкай школах, піша вершы, апавяданні, любіць замежныя мовы. Яе працоўны стол — побач з маім.



Сям'я Крыцкіх, фота з сямейнага архіву

**У даведачнай базе Леаніда Маракова я знайшла дадзеныя на свайго рэпрэсаванага прадзеда. Станіслаў Іванавіч Крыцкі нарадзіўся ў Віцебскай вобласці ў 1881 годзе. Старое фота занатавала момант шлюбу ў касцёле. Яго нявеста пані Ружа паходзіла са збяднелай шляхты. Станіслаў Іванавіч вадзіў цягнікі з Рыгі на Беларусь, у Крыцкіх было трое дзяцей. У 1933 годзе прадзед быў арыштаваны: уначы да дома пад'ехаў чорны варанок, і родны чалавек знік. У картатэцы Леаніда Маракова значыцца нумар яго справы і судовы вырак — пяць гадоў лагераў за антысавецкую дзейнасць. Прадзеда адправілі на Беламора-Балтыйскі канал.**

ПАДАРОЖНЫЯ НАТАТКІ

# КРЫЖЫКІ МОНТЭНЕГРА

Марыя Мартысевіч

**"Крыжы Монтэнегра" — другое ў тваім жыцці эсэ Уладзіміра Арлова, якое табе захацелася перапісаць. Перад паездкай ты сустрэла яго аўтара на мінскім вакзале, і ён парэкамендаваў табе гэты тэкст як "настраёвае чытво ў дарогу". Паездка не абяцала быць лёгкай — пачынаючы ад Бялграду, каля пяцісот кіламетраў галоўнай чарнагорскай магістраллю — вузкай горнай трасай, над якой — аргазмічнай прыгажосці горы, паабапал якой — фантасмагарычныя прорвы з плыткімі рэактыўнымі рачулкамі, уздоўж якой — рэгулярныя, нібы капліччкі для пілігрымаў, помнікі тым, хто сарваўся тут да цябе.**

Арлова тут ванітавала. У вашай вандроўцы пасля хуткай вячэры, з'едзенай у Бялградзе, кілбасіць не цябе, а тваю сяброўку. У вас начны пераезд. Свет у салоне прыглушаны, а недасведчаны ў горных віражах беларускі аўтобус заносіць то ўлева, то ўправа. Аднойчы ў жыцці ты ўжо зазнала падобныя фізічныя адчуванні. У Кракаўскім аквапарку ёсць адна страшная вадзяная горка. Купальшчык на шалёнай хуткасці, развітваючыся па дарозе з жыццём, ляціць долу на крутых віражах, але вылятае ў адкрытую ваду не адразу. Труба выштурхвае яго ў ёмістасць, па форме падобную да лятучай талеркі, а па атмасферы — на улонне маці. Чалавека круціць у ёй, тармозячы, два-тры віткі, пасля чаго вада мякка выплёўвае яго на свабоду. Гэтак сама з вузкай небяспечнай цясніны шашы аўтобус плаўна выязджае, пашыраючы віткі спуску, на схіл даліны, унізе якой у промнях світання разлёгся твой курорт. Арлоў, едучы гэтай дарогай, думаў пра "мастацтва паміраць" і шчасце перажыць гэты горны перавал. У цябе гэты пераезд асацыюецца адно з нараджэннем.

## Ніно

У сезон на курортах Чарнагорыі разгортваецца зацятая барацьба паміж экскурсійнымі кампаніямі. Чым толькі не забаўляюць турыстаў зазывалы! Адзіны забаронены прыём — нельга збіваць кошты. Барацьба за кліента ідзе да вечара. Не прыпыняецца яна і зранку, калі фірмы забіраюць групы з паркоўкі ў цэнтры горада. На паркоўцы дзяжурыць блакітнавокі бландзін, два метры сексу, у татуіроўках на мускулістых руках ды нагах. Гэты Тарзан белазуба і томна спрабуе пераканаць цябе, што твой аўтобус адмяніілі, а ў ягоным акурат ёсць вольнае месца. Ты амаль даеш яму веры. Але вось падаюць твой аўтобус. Ён апынаецца не такім бліскучым, як аўталайнер Тарзана, і ўвогуле малапрэзентабельным, а гід — сціплым, маленькім і непрыкметным. Дый яшчэ завуць яго Ніно, што адразу ж выклікае ў цябе згадкі пра рамантычную гісторыю Амелі, а ў тваіх спадарожніц, дзвюх праставатых цётак, не выклікае, і цягам экскурсіі яны раз-пораз дражняцца, пакуль хлопец не чуе: "А куда эта падзявалася наша Ніна?"

Чарнагорцы расслабленыя. Тут Арлоў мае рацыю. З усіх магчымых паштовак, якія б ты магла выслаць з курорту сябрам, цябе прыцягвае тая, на якой сфармулявана "10 чарнагорскіх запаветаў": "Любі ложак свой, як самога сябе"; "Калі бачыш, што нехта адпачывае, — неадкладна дапамажы яму ў яго справе", — і іншыя, пад якімі ты, не задумваючыся, падпісваешся. Але, слухаючы Ніно падчас экскурсіі, ты разумееш: чарнагорцы — народ, які фантастычна любіць сваю краіну і ганарыцца ўсімі яе 13-цю тысячамі квадратных кіламетраў, кожным горным хрыбтом, ракой ці возерам і ўсім, што звязана з гэтай тэрыторыяй у мінулым, цяперашнім і будучыні. Белакаменнымі горнымі праваслаўнымі манастырамі XII стагоддзя тут хваляцца не менш, чым пяцізоркавымі гатэлямі, якія будуць стаяць на тым ці іншым месцы праз 5–10 год, а пакуль вытыркаюцца над краявідам пачварнымі каркасамі.

Ніякіх спічаў датычна спрадвечнай чарнагорскай мовы і унікальнай гісторыі (тое, што ўжо год 20 наўпрост асацыюецца ў цябе з незалежніцкімі працэсамі ў той ці іншай краіне) ты чамусьці не чуеш. Ты робіш выснову — моўна-этнічныя пытанні — надстройка, якая надбудоўваецца над непахісным базісам, імя якому — уязны турызм. У 2006-м Чарнагорыя аддзялілася ад Сербіі ўсёй берагавой лініяй і цяпер павольна, але верна распрадае пляжы багатым рускім, амерыканцам ды сінгапурцам. Краіна — бізнес-праект, і найвышэйшы чарнагорскі патрыятызм — брацць пасільны ўдзел у гэтым нацыянальным бізнесе. Багатае ўзбярэжжа мусіць выцягнуць з галечы адсталую горную частку краіны. Падгорыца — сталіца Чарнагорыі — мае памеры і ауру буйнога беларускага райцэнтру, але ў кожным кавалачку гарадской панарамы чытаецца: галоўнае яшчэ наперадзе.

## Мілорад

Афіцыянт рэстарацыі, дзе вы абедаеце штодня, яўна на цябе запаў. Ён называе цябе "златка" (у адказ табе нязменна хочацца абазваць яго "хадуном") і перыядычна намагаецца не ўзяць з цябе грошай за абед — і без таго сімвалічных. Потым вы амаль выпадкова сутыкаецеся на вечаровым пляжы, і падчас вашага імправізаванага спаткання выяўляецца, што афіцыянт мае шмат агульнага з Уладзімірам Арловым. З усіх жанчын у свеце ён аддае перавагу беларускам. Каб давесці табе гэта, ён выцягвае мабільнік, у якім запар ідуць тэлефоны: "Tanja Belorussia, Katja Minsk, Sveta Baranovichi"…

Яго завуць Мілорад, і ён кранальна спрабуе пераканаць цябе, што яму на год 10–15 меней, чым ёсць насамрэч. Ён просіць і твой нумар тэлефону ў сваю калекцыю перамогаў на мілосным фронце балканска-беларускага сяброўства. Адкруціцца аказваецца лягчэй, чым табе здавалася. Сербы — а ў абслузе тут працуюць пераважна панаехалыя на сезон сербы — лавеласы, але іх увага ненавязлівая. Кожны прадавец ці афіцыянт лічыць неабходным табе падміргнуць і спакусліва пасміхнуцца — да канца свайго



побыту ты пачынаеш успрымаць гэта як належнае — як цукеркі ці ментолавыя пасцілкі, што падаюць у некаторых кавярнях разам з рахункам.

## Борыс

Ваш кантакт з Мілорадам усталяваўся пасля таго, як ты адмовілася браць меню на рускай ці ангельскай мовах, упарта спрабуючы агучыць замову па-сербску. Вялікіх поспехаў у сербскай мове за гэты тыдзень ты не зробіш — твой адзіны падручнік — кішэнны размоўнік, арыентаваны да таго ж не на рускамоўных фанатаў Балканаў, а на сербаў, якія хочуць навучыцца па-руску. У тваіх штудыях з'яўляецца пабочны эфект — проста як у "Віягры", якую былі распрацоўвалі як прэпарат ад хваробаў сэрца. Твае спробы гаварыць па-сербску ўспрымаюцца як непрыхаваны флірт.

Другі чалавек, з якім ты пазнаёмілася такім чынам, — Борыс, бармен у бары на запраўцы ў горнай частцы краіны. Гатуючы табе "црни чај", ён пачуў тваю скаргу што за 10 дзён турпаездкі ты хочаш вывучыць сербскую мову, але ніхто цябе не падтрымлівае. Ён паабяцаў дапамагчы табе ў тваіх мужных пачынаннях — сербскую мову як носьбіты лічаць гіперскладанай для вывучэння. Што праўда, хутка вы з Борысам, да ўзаемнай палёгкі, пераключаецеся на англійскую. Борыс — марак гандлёвага флоту, які чакае свой карабель і, каб не нудзіцца дома, працуе, разліваючы падарожным каву, гарбату і ракію. За суседнім столікам пры піве сабралася цёплая кампанія — яго сябры. Яны перыядычна ўскокваюць і танчаць нешта сярэдняе паміж кан-канам і сіртакі. Ты ніяк не згадаеш, як называецца гэты балканскі танец. "Напішы пра Зорана, журналістка! Яго продкі спусціўся з гор у канцы XIX стагоддзя, яны там усе адмарожаныя. Калі яму было 20 гадоў, і яго бацька саджаў яго на цягнік, выпраўляючы на службу ў войска, ён працягваў рукі да паравозу і крычаў: "Тата, купі мне гэту цацку!"

— Ты любіш сваю краіну? — пытаешся ты ў Борыса, бо што яшчэ можна паспець запытацца за адну хвіліну, што засталася да ад'езду, у чалавека, якога больш ніколі не пабачыш.

— Тупое пытанне. Люблю, канешне. А што, ёсць людзі, якія не любяць сваю краіну?

Ты моўчкі азіраешся на сваіх суайчыннікаў, якія сядзяць пад парасонамі на вуліцы. Выгоды і недахопы краіны за вакном аўтобуса і ці хацелі б яны зваліць менавіта сюды — вось тое, пра што разважалі твае суайчыннікі, пакуль ехалі да гэтай горнай запраўкі праз усю Еўропу.



## Чорныя горцы і белыя рускія

Тое, чаго ты ніяк не можаш прыняць у пафасе эсэістыкі Арлова, на якім, чаго ўжо там хаваць, выхоўвалася, — гэта яго паслядоўная непрыязнь да Расіі. Рускіх тут халерна шмат. Гэта праўда. Яны голасна перамаўляюцца на вуліцах і гушкаюць сваіх "младзенцаў", якіх завуць Елісей і Анфіса. Але ты не можаш не прызнаць: чарнагорцаў ды сербаў на пляжы ніяк не меней — яны таксама гучна перамаўляюцца на вуліцах і ў рэстарацыях, шумна кахаюцца ў суседніх дамах і гушкаюць сваіх немаўлятак, якіх завуць нейкімі нязвыклымі балканскімі імёнамі. І нават сваіх любых украінцаў, якія пераважна моўчкі ці пошапкі, але ўсё-ткі гушкаюць на пляжы сваіх Назарку і Хрыстыну, ты прыкмячаеш тут даволі шмат.

Табе пачынае здавацца, што праблема рускіх на курортах свету значна перабольшаная. Іх дэмаграфічна болей — вось і ўсё. Ты пачынаеш разумець, што праблема рускіх і Расіі для апантанага самаідэнтыфікацыяй беларуса — унутраная праблема. Гэтак сама падлетак-нефармал шчасных 90-х аднойчы ўсведамляў, што гопнікі, канешне, зло, і яны паўсюль, але яго гэта ўжо неяк не надта тычыцца. Ён перарос.

## Крыжыкі

Чым вонкава, апроч шакаладнага загару і тонкіх рысаў твару адрозніваюцца чорныя горцы ад белых рускіх (у тым ліку ад цябе) — гэта крыжыкі. У тутэйшых праваслаўных яны збольшага драўляныя ці цыновыя, а не залатыя ці срэбныя. І збольшага не на шыі — а на руцэ, у выглядзе невялічкага ніцянога ці пацеркавага ружанцу. Пераважна чорнага колеру, ясная рэч. Гэтыя сціплыя "фенечкі" распаўсюджаныя на ўсім праваслаўным Міжземнамор'і як універсальны знак таго, што ты належыш да грэцкага абраду.

…Калі трапляеш у маленечкія старажытныя цэркаўкі і манастыры Чарнагорыі, ты напоўніцу адчуваеш квітэсенцыю веры. І ніякага наносу ў выглядзе той царкоўнай ідэалогіі, якая на кожным рагу падпільноўвае цябе дома. Менавіта ў Чарнагорыі ты ўпершыню адчуваеш непадробны і бязмежны гонар за тое, што ты праваслаўная. У якасці падарунку сябрам і сваякам ты імкнешся накупіць як мага болей ніцяных крыжыкаў.

## Горы і мора

"Твайму народу не стае не толькі выйсця да мора, але і выйсця да неба — гор". Куды б ні ехаў Арлоў у сваім зборніку эсэ "Сланы Ганібала", у думках, метафарах і асацыяцыях ён усё адно з Беларуссю. Нават у Чарнагорыі, з якой, як ён сам крыху скрушліва прызнаецца, у Беларусі няма ніякіх гістарычных аналогіяў. А вось табе тут ні кропелькі не хочацца думаць ні пра якую Беларусь (зрэшты, чаго ўжо там — тут табе ўвогуле ні кропелькі не хочацца думаць). Заплываеш у мора да межаў дазволенага берагавой аховай і павісаеш на буйках. Боўтаешся сабе ў Адрыятыцы. І раптам разумееш: Арлоў на тваім месцы абавязкова зазначыў бы: павісаеш на бел-чырвона-белых буйках. Але ты бязмежна далёкая ад усяго гэтага. Ну і няхай буйкі бел-чырвона-белыя. Затое мора сіняе. А горы — зялёныя.

▸ АВАНГАРД

# "ЖАЛЕЗНЫ ВОЎК": ПІКАСО І НЕ СНІЛАСЯ

Ганна Кот

**Герояў можна маляваць не толькі ва ўзвышана-напышлівым рэалізме, але і раскласці іх на каляровыя плоскасці кубізму, дадаць сярэднявечнай асіметрыі ці нават прымусіць пазяхаць.**



Ад гэтага яны не перастануць быць героямі, лічыць кіраўнік полацкага творчага аб'яднання "Жалезны воўк" Андрусь Мікалаеў. Мастакі названай суполкі сталіся аўтарамі экспазіцыі "Неасармацкі партрэт", што нядаўна ўпершыню адбылася ў Музеі гісторыі беларускага кіно. Па сутнасці, яны запачаткавалі, стварылі новы жанр — неасармацкі жанр.

Большасць мастакоў суполкі "Жалезны воўк" яшчэ толькі пачынаюць свой творчы шлях. Аднак ёсць сярод аўтараў і сталыя майстры з багатым досведам выстаў, такія, напрыклад, як Георгій Танковіч — сябра Беларускага саюза мастакоў. Сустракаюцца і замежныя творцы. Немка Хрысціна Шмідт свой першы партрэт у неасармацкім стылі намалявала, можна сказаць, выпадкова. Падчас студэнцкага абмену яна неяк завітала ў творчую майстэрню Андруся Мікалаева — і паддалася агульнаму натхненню. Андрусь узгадвае, што над карцінай мастачка працавала нястомна, як "сапраўдная нямецкая машына", без увагі на ежу і адпачынак. Вынікам стаўся партрэт у духу добрага нямецкага сентыменталізму пад назвай "Заканчэнне эпохі", на якой намаляваны, так бы мовіць, рыцар "на пенсіі". Ён ужо адпусціў свайго баявога каня на волю, але сам ніяк не можа забыцца на слаўную эпоху вайсковай славы.

Кіраўнік суполкі "Жалезны воўк" называе сваіх калегаў рамантыкамі. Не дзіва, калі ведаць, што калісьці сармацкі партрэт выкарыстоўваўся выключна для выявы адважных герояў. У XV–XVIII стагоддзях гэта была надзвычай папулярная форма параднага рыцарскага партрэту ў выяўленчым мастацтве Вялікага княства Літоўскага, а потым і Рэчы Паспалітай. Сармацкі партрэт адлюстроўваў сабою цэлую ідэалогію, згодна якой шляхта з'яўлялася нашчадкамі ваяўнічых плямёнаў сарматаў, што ў III ст. да н.э. — IV ст. н.э. насялялі прычарнаморскія стэпы, а пазней сышлі на поўнач ды зніклі з мапы гісторыі.

Сарматызм стаўся светапоглядам, культурай і ладам жыцця шляхты. Галоўным сваім абавязкам яны лічылі вайсковую справу і абарону Бацькаўшчыны і Каталіцтва. Чалавек на сармацкіх партрэтах паўставаў у парадным адзенні, у атачэнні прадметаў, што выяўлялі не толькі яго ўнутраны свет, характар, але і перадавалі прыналежнасць да той ці іншай саслоўнай групы, давалі магчымасць даведацца пра становішча асобы ў грамадстве. Найбольш традыцыйнымі помнікамі гэтага жанру сёння мастацтвазнаўцы лічаць партрэты Юрыя Радзівіла ды Яна Сабескага.

Дзякуючы сумеснаму праекту рыцарскага клубу "Жалезны воўк" (менавіта на яго аснове дзейнічае аднайменная творчая суполка) і беларускіх мастакоў традыцыя гераічнага партрэту аднавілася праз два стагоддзі забыцця.

Першы партрэт у неасармацкім стылі — "Жалезны воўк" Алега Елізарава — быў намаляваны ў 1999–2000 гадах у сапраўдным сярэднявечным стылі. Па тэхніцы ён вельмі нагадвае ікону. Без захавання перспектывы, сіметрыі ды прапорцый. Ён настолькі падобны да старажытнай карціны, што здараліся нават кур'ёзныя выпадкі, калі людзі запытваліся, колькі ж стагоддзяў гэтаму твору, распавядае Андрусь Мікалаеў.

З часам на змену жорсткім канонам прыйшла стылявая разнастайнасць. Маляваць у поўнай згодзе са сваёй фантазіяй было для маладых неасарматаў значна цікавей, чым прытрымлівацца выдуманых амаль паўтысячагоддзя таму правілаў.

Вынікам крэатыўнага падыходу да традыцыі стала серыя палотнаў у стылі аналітычнага кубізму, прысвечаная 100-годдзю гэтага стылю. Узніклі эксперыментальныя, абстрактныя і супрэматычныя партрэты. У той жа час працягваў развівацца рэалістычны партрэт. Такім чынам, традыцыйны "сармацкі партрэт" атрымаў далейшае развіццё і прыстаўку "неа" ў назве жанру.

"Неасармацкі жанр — гэта эвалюцыя сарматызму, — тлумачыць сутнасць зменаў кіраўнік творчай суполкі "Жалезны воўк" і "галоўны ідэолаг" новага жанру Андрусь Мікалаеў. — Калісьці мастак нават не мог уявіць сабе рыцара, які б смяяўся, або, барані Божа, перамотваў "парцянкі". Але ж рыцары таксама людзі! Таму мы дадалі да традыцыйнай гераічнай асновы сюжэт ды эмоцыі. І атрымаўся "жывы" чалавек, які крывіцца ад болю, цешыцца, пазяхае.

Апошні партрэт, дарэчы, трапіўшы на віртуальную нямецкую выставу, вельмі спадабаўся тамашняй аўдыторыі. Кажуць, калі на яго доўга глядзець, дык можна таксама пачаць пазяхаць.

Сёняшні выгляд неасарматызму Андрусь лічыць далёка не апошняй кропкай ягонага развіцця: "Жанр ужо выйшаў за рамкі жорсткіх канонаў, але што будзе далей, мы пакуль і самі не ведаем", — усміхаецца абаяльны кіраўнік "Жалезнага ваўка", пакідаючы прыхільнікам рамантычнага жанру прастору для асабістай фантазіі".

▸ ЮБІЛЕЙ

# КСЯНДЗУ ПРОБАШЧУ УЛАДЗІСЛАВУ ЗАВАЛЬНЮКУ — 60 ГАДОЎ

Аляксей Хадыка

**Постаць знанага каталіцкага святара звязваюць з адраджэннем рэлігійнага жыцця ў Беларусі ў апошнія пару дзесяцігоддзяў. Урачыстыя, традыцыйныя для Мінска працэсіі свята Божага Цела, аднаўленне паломніцтваў і рэлігійнага жыцця аднаго з найважнейшых санктуарыяў краіны ў Будславе, насычанае духоўнае жыццё прыходу Святых Сымона і Алены, Чырвонага касцёла, які нават у савецкія часы (тады маўклівы, толькі аблічам) заставаўся візітоўкай сталіцы.**



Святар, які не цураецца сучаснага штодзённага жыцця, — удзельнічае ў дыскусіях на ТБ і на старонках прэсы, нават галадуе (у пратэсце супраць брутальнай трактоўкі гісторыі царквы ў скандальным "Кодзе да Вінчы"), спрабуючы давесці сваю праўду і веру ў Хрыста да людзей. Мужна адчыняе храм для паніхіды па вернай каталічцы Ірыне Казулінай.

Ушанаванні выдатных беларускіх паэтаў у касцёле, калі апошнім зрабілася няўтульна ў іншых месцах горада, выданне кнігі духоўнай паэзіі Рыгора Барадуліна "Ксты" і намінаванне аўтара на атрыманне Нобелеўскай прэміі. Дольная зала касцёла, якая даўно ўжо адчынена — хіба за выключэннем часу посту — для музыкаў, літаратараў. Служэнне не савецкай, а хрысціянскай Беларусі, з лагічным жаданнем, каб касцёл стаяў на вуліцы, якой нададзена імя фундатара святыні, Эдварда Вайніловіча. Нават да жадання ўславіць памяць чалавека, якому горад удзячны за храм, паэмай-казаннем "Так хацеў Бог!", выдадзенай напярэдадні 100-годдзя фундацыі, што адбудзецца ў 2010 годзе.

Храм на плошчы Незалежнасці, супрацьстаючы тлуму і бязладдзю выпадковых падзей навокал, пад апекай шчырага і энэргічнага пробашча даўно зрабіўся цэнтрам інтэлектуальнага жыцця. Невыпадкова пад кіраўніцтвам Уладзіслава Завальнюка, па падліках старшыні Прафесарскага клуба пры касцёле Міхаіла Цяўлоўскага, выдадзена каля 50 кніжак. Большасць — на беларускай мове. З апошніх і самых значных — праца самога ксяндза-дэкана "Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі" і падрыхтаванае пад яго кіраўніцтвам калектывам перакладчыкаў сучаснае "Евангелле". Зробленае так, каб і мова, і імёны, і назвы геаграфічных мясцін загучалі і па-беларуску, і адначасова прымальна для прадстаўнікоў розных хрысціянскіх канфесій Беларусі. Дзеля яднання ў веры, ведах і любові нашай укрыжаванай на шляхах гісторыі краіны.

"Айцец Уладзіслаў — сталы і актыўны сябра Рады ТБМ, дзейнасць якой цяжка ўявіць без яго ўдзелу. Ён украінец, але, ведаючы нямала моваў, падчас свайго святарскага служэння ў нашай краіне зрабіў выбар на карысць беларускай, якую ўжывае як родную. І яго намаганнямі паўстала асаблівая нацыянальная атмасфера ў такім знакавым для сталіцы храме, як касцёл Святых Сымона і Алены. Яго казані глыбокія, эмацыйныя, сардэчныя: вось і ў яго юбілей словы ў касцёле гучала па-беларуску", — зазначыў старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў.

Зычым юбіляру добрага ўраджаю ў яго духоўнай сяўбе!

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Алена Анісім
Шэф-рэдактар Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА: 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 10.07.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.